РАДЫЕ у гадз. ночы:

Спыненьне польска-нямецкіх перагавораў
ВАРШАВА, 15. У сувязі з затрудненьнямі, якія ўзьнікілі ў польска-нямецкіх перагаворах па заключэньні гандлёвага дагавору, перагаворы спынены.

1.465.000 франкаў у фонд абароны „Юманітэ"
ПАРЫЖ, 15. Фонд абароны «Юманітэ» дасягнуў учора сумы 1.465.000 франкаў (ТАСС).

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 288 (3396) Аўторак 17 сьнежня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд.: Менск, Замковая, 33
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, [illegible]—812, [illegible]—731

АПОШНІЯ НАВІНЫ **Б. С. С. Р.**

Жанчыны-чырвоныя дырэктары прадпрыемстваў

За апошні час рад работніц вылучаны на адказныя пасады: т.т. Танская—намесьнікам дырэктара фабрыкі «Дзьвіна» (Віцебск), Шнуклер—намесьнікам дырэктара швейнай фабрыкі «Кастрычнік» (Менск), тав. Гарбунова—намесьнікам дырэктара фабрыкі «Везуві», тав. Зьвягіна—намесьнікам дырэктара фабрыкі Вітшвей, тав. Берліна—намесьнікам дырэктара Белшвейтрэсту. Усе вылучэнкі—актыўныя работніцы з вялікім вытворчым стажам.

Усебеларуская нарада аграрнікаў-марксыстых адкрываецца сёньня, 17 сьнежня, а 10 гадз. раніцы, у залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б. Уваход па мандатах і запрашальных білетах.

За пералом у рабоце па вярбоўцы рабочых у партыю

Наша прэса сыгналізуе пагрозу невыкананьня дырэктыў аб вярбоўцы рабочых у партыю. Аб гэтым-жа гаворыць рад пастаноў партыйных камітэтаў.

ЦК партыі па дакладу аб вярбоўцы ў партыю на **«Бальшавіку»**, у **Заліненай** арганізацыі, гарадской **Бабруйскай** арганізацыі адначыў рад карэнных недахопаў пры вярбоўцы ў партыю.

Мы павінны канстатаваць, што ня ўсімі і ня ўсюды ўсьвядомлена неабходнасьць узмацненьня вярбоўкі ў партыю перадавых рабочых і батракоў. Вярбоўка да гэтага часу не займае належнага месца ў рабоце партарганізацый і асобных партыйцаў.

Трэба дабіцца пералому ў рабоце КП(б)Б па вярбоўцы рабочых у партыю.

Недаацэнка палітычнай важнасьці, палітычнай патрэбнасьці прысьпешанага росту партыі за лік лепшых **перадавых** пралетараў зьяўляецца асноўнай і сур'ёзьнейшай перашкодай да паляпшэньня работы па вярбоўцы.

Трэба дабіцца ўсьведамленьня ўсімі партыйцамі таго, што наша партыя арганічна варожа да культу беспартыйнасьці. Нам трэба напомніць таварышом, якія забылі, што **Ленін** самым моцным чынам змагаўся супроць тых, хто ў сваёй рабоце ў простай або ўскоснай форме ігнараваў неабходнасьць уцягненьня перадавога сьвядомага рабочага ў рады партыі.

Трэба, каб кожны партыец усьвядоміў, што гігантскі размах сацыялістычнага будаўніцтва ва ўмовах абностранай клясавай барацьбы патрабуе новых тысяч і мільёнаў арганізатараў, кіраўнікоў і што **гэтыя сілы наша партыя павінна чэрпаць з рабочых мас.**

Наша партыя вылучала і будзе далей вылучаць лепшых перадавых беспартыйных рабочых на кіраўнічую работу. Вылучэньне беспартыйных мае сваёй мэтай і больш хуткае выхаваньне іх на актыўнай палітычнай рабоце для ўцягненьня лепшых з іх, якія даказалі сваю адданасьць інтарэсам пралетарыяту, у партыю.

Аднак з прычын слабой пастаноўкі вярбоўкі ў партыю зьяўляецца частае спасыланьне на тое, што «няма таго вер баваць у партыю». Ня гледзячы на тое, што партыя ня раз рэзка асуджала такія погляды, гэтыя настроі яшчэ моцныя ў арганізацыях. Наяўнасьць такіх настрояў часамі параліжуе ўсю работу па вярбоўцы рабочых у партыю.

Інакш кваліфікаваць такія настроі **як няверр'е ў сілы рабочае клясы, як няверр'е ў сілы і аўтарытэт партыі, нельга.** Гаварыць аб тым, што няма каго браць у партыю, могуць толькі бліварукія, адарваныя ад сапраўдных кадраў рабочых, людзі, якія ня ведаюць настрояў рабочае клясы.

Лепшым адказам людзям з такімі настроямі зьяўляецца сацыялістычнае спаборніцтва на нашых прадпрыемствах і ўдарныя брыгады. На кліч партыі дабіцца ажыцьцяўленьня пяцігодкі, мільёны адказалі сацыялістычным спаборніцтвам, сотні тысяч рабочых адказалі арганізацыяй ударных брыгад. Ня менш паловы ўдарнікаў—гэта беспартыйныя перадавыя рабочыя. Яны не на словах, а на справе, пакамуністычнаму даводзяць сваю адданасьць пралетарскай рэвалюцыі. Варта толькі параўнаць рост актыўнасьці рабочых у сацспаборніцтве з ростам партыі за лік рабочых, каб пераканацца, што партарганізацыі ня здолелі **скарыстаць магутнай хвалі ўздыму для таго, каб уцягнуць лепшых з іх у партыю.** Хіба можна паверыць усім гутаркам аб тым, што «ў нас мала такіх, якіх можна ўцягнуць у партыю», калі сотні тысяч рабочых добраахвотна павышаюць прадукцыйнасьць працы, зьніжаюць расцэнкі, павышаюць нормы.

Між тым, мы надзвычайна мала зварачаем увагу на ўцягненьне ў партыю тых, хто аказаўся ўперадзе ў сацспаборніцтве, лепшых з ударнікаў. Ударнікі-ж зьяўляюцца такімі рабочымі, якія паказваюць прыклад камуністычных адносін да інтарэсаў сацыялістычнай вытворчасьці.

Трэба пачаць узмоцненую вярбоўку ўдарнікаў у партыю. Трэба дабіцца энэргічнай і актыўнай работы партарганізацый цалкам і асобных партыйцаў у вярбоўцы, трэба самым рашучым чынам змагацца з пасыўнымі адносінамі да вярбоўкі, чаканьнямі прыпёку ў партыю, «настроям самацёку» павінна быць абвешчана самая рашучая барацьба.

Прыклад з ударнікамі зьяўляецца выразнай ілюстрацыяй наступнага карэннага недахопу ў рабоце па вярбоўцы ў партыю: вярбоўка дрэнна ўвязваецца з тэй грандыёзнай палітычнай і практычнай работай, якая разгортваецца на прадпрыемствах.

Трэба проста сказаць, што спэцыяльная вярбовачная работа ў нас пастаўлена вельмі дрэнна. Мы мала, вельмі мала арганізоўвалі спэцыяльныя даклады аб уступленьні ў партыю, а гэта-ж вельмі важна. Трэба арганізаваць на прадпрыемствах сэрыю дакладаў на тэмы: «што такое камуністычная партыя і чаму рабочы павінен быць членам партыі камуністых-бальшавікоў». Дакладчыкамі павінны быць нашы лепшыя прапагандыстыя, найбольш аўтарытэтныя таварышы.

Мы злачынна мала скарыстоўваем літаратуру аб вярбоўцы ў партыю, трэба выдаць на розных мовах невялікія брашуркі, можна скарыстаць тыя брашуры, якія былі выданы ў пачатку гэтага году, трэба выпускаць спэцыяльныя нумары пасьценгазэт на тэмы аб вярбоўцы. **Усё гэта трэба рабіць сыстэматычна.**

Тут толькі некалькі пытаньняў, закранутых у сувязі з вярбоўкай у партыю. У розных мясцох ёсьць рад другіх прычын, якія тармозяць узмацненьне росту партыі за лік рабочых. Бальшавіцкая самакрытыка, паляпшэньне масавай работы, уцягненьне ўсіх рабочых у актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва, праверка і чыстка вытворчых ячэек дадуць свае вынікі, прыцёк у партыю ўзмоцніцца.

Для таго, каб забясьпечыць больш хуткі пералом у гэтай рабоце з боку арганізацый, каб дабіцца максымальных вынікаў, трэба сыстэматычна правяраць, як выконваюцца дырэктывы аб росьце партыі ў арганізацыях і ячэйках.

Калі ўся работа па вярбоўцы ў партыю стане сапраўды ў цэнтры ўвагі ўсіх арганізацый КП(б)Б, мы ажыцьцёвім тыя задачы, якія партыя паставіла і ў галіне яе далейшага росту.

110 прадпрыемстваў БССР на бесьперапынку
Пастанова СНК БССР

На апошнім пасяджэньні СНК была прынята пастанова аб пераходзе прадпрыемстваў дзяржаўнай прамысловасьці на бесьперапынны тыдзень і аб задачах, якія стаяць у сувязі з гэтым перад наркаматамі.

Усяго ў 1929-30 годзе на бесьперапынны тыдзень будзе пераведзена 110 прадпрыемстваў і асобных цэхаў.

На бесьперапынны тыдзень пераводзіцца да 83,4 проц. усіх рабочых, занятых у рэспубліканскай прамысловасьці па групе «А» (керамічная, фасфарытная, шкляная, мэталёвая і дрэваапрацоўчая) і 74,4 проц. па групе «Б» (тэкстыльная, швэйная, панчошна-трыкатажная, гарбарная, запалкавая, харчовая, папяровая і паліграфічная).

Перавод на бесьперапынны тыдзень дасьць магчымасьць уцягнуць у вытворчасьць да 3.500 рэзэрвовых і новых рабочых, дасьць дадатковую прадукцыю на 21.500.000 рублёў і дадатковае накапленьне каля 5 мільёнаў рублёў пры нязначным павялічэньні капітальнага будаўніцтва.

Улічваючы, што перавод некаторых прадпрыемстваў на бесьперапынку патрабуе дадатковага іх забесьпячэньня дэфіцытным сырцом (мэталёвая, швэйная, акулярная і ільняная прамысловасьць), СНК БССР пастанавіў паставіць пытаньне перад урадовай камісіяй СССР аб забесьпячэньні гэтых галін прамысловасьці патрэбнай колькасьцю сырцу. Перавод гэтых прадпрыемстваў на бесьперапынны тыдзень праводзіць тольки пасьля таго, як будзе поўнасьцю забясьпечана бесьперабойнае здавальненне іх сырцом і забясьпечаны збыт гатовага тавару.

СНК запрапанаваў Наркампрацы і ВСНГ БССР прыняць усе неабходныя меры да своечасовага забесьпячэньня гэтых прадпрыемстваў патрэбнай дадатковай рабочай сілай.

У мэтах найлепшага абслугоўваньня рабочых і служачых СНК пастанавіў перавесьці на бесьперапынны тыдзень мэдыка-санітарныя ўстановы гарадоў, прамысловых раёнаў і рабочых пасёлкаў.

Наркамаховаы здароўя разам з РСІ і прафсаюзнымі арганізацыямі запрапанавана перагледзець сьпіс мэдыка-санітарных устаноў дзяржбюджэту, якія падлягаюць пераводу на бесьперапынны рабочы тыдзень, і высьветліць патрэбнасьць іх у дадатковых сродках. Наркамфіну запрапанавана адшукаць гэтыя сродкі.

Наркамасьветы і Народнаму Камісарыяту аховы здароўя запрапанавана прыняць меры да пашырэньня і паскарэньня падрыхтоўкі кадраў мэдпрацаўнікоў шляхам стварэньня адпаведных курсаў па падрыхтоўцы.

Для найлепшага абслугоўваньня рабочых, якія пераводзяцца на бесьперапынны тыдзень, Наркамасьветы запрапанавана перавесьці ўсе вячэрнія тэхнікумы, унівэрсытэты і рабфакі на бесьперапынны тыдзень. Запрапанавана таксама ў месячны тэрмін прадставіць урадовай камісіі праект пераводу на бесьперапынны тыдзень іншых навучальных устаноў.

На пазьней 1-га студзеня 1930 г. усе тэатры, кіно, клюбы і бібліятэкі павінны быць пераведзены на бесьперапынны рабочы тыдзень.

Наркамасьветы і Наркамаховы здароўя запрапанавана перавесьці на бесьперапынны тыдзень усе дашкольныя ўстановы і дзіцячыя ясьлі, дзе навучаюцца дзеці работніц, прадпрыемстваў якіх пераводзяцца на бесьперапынны тыдзень.

Наркамгандлю даручана ў 2-хтыднёвы тэрмін прадставіць урадовай камісіі плян пераводу гандлёвых прадпрыемстваў на бесьперапынку для найлепшага абслугоўваньня рабочых.

Амэрыканскія „міратворцы" ў Гаіці

НАСЕЛЬНІЦТВА РЫХТУЕЦЦА ДА РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ СУПРОЦЬ АМЭРЫКАНСКАЙ АКУПАЦЫІ

НЬЮ-ЁРК, 14. Палкоўнік Кэтс, начальнік амэрыканскае морскае пяхоты ў Гаіці заявіў, што «нездаволеныя пласты насельніцтва ў Гаіці задумваюць правесьці рашучую рэвалюцыю супроць прэзыдента Борна і супроць амэрыканскай акупацыі. Па словах Кэтса, апазыцыя хоча скарыстаць забастоўкі ў сельска-гаспадарчым інстытуце і ў мытні для таго, каб «пачаць палітычную рэвалюцыю».

БУРНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫІ Ў ГАІЦІ

НЬЮ-ЁРК, 14. Перад будынкам Ньюёркскага муніцыпалітэту адбылася арганізаваная кампартыяй дэманстрацыя пратэсту супроць інтэрвэнцыі ў Гаіці, супроць канфэрэнцый, скліканых Гувэрам у сувязі з эканамічным крызісам, а таксама супроць ноты Стымсона ў СССР. На дэманстрантаў напала конная паліцыя. Паранена шмат рабочых і адзін паліцэйскі. 10 рабочых арыштавана.

У Вашынгтоне перад белым домам і дзяржаўным дэпартаментам таксама адбылася вялікая дэманстрацыя пратэсту. Паліцыя арыштавала 50 рабочых удзель нікаў дэманстрацыі. (ТАСС).

Да савецка-кітайскіх перагавораў
Гутарка з панам Цай Юнь-Шэнам

ХАБАРАЎСК, 14. Супрацоўнік «Роста» ў гутарцы з Цай Юнь-Шэнам і Лі-Шао-гэнам закрануў наступныя пытаньні:

1. Ці зьяўляюцца Цай і Лі Шао-ген прадстаўнікамі ўраду трох Усходніх правінцый, ці таксама і цэнтральнага ўраду?

Адказ:—**Мы зьяўляемся прадстаўнікамі ўраду трох Усходніх правінцый, а таксама цэнтральнага ўраду ў Нанкіне.**

2. Як доўга будуць працягвацца перагаворы ў Хабараўску і які будзе іх зьмест?

— Мы спадзяемся, што пры перагаворах у Хабараўску ў хуткім часе дасягнем згоды па ўсіх пытаньнях. Зьмест перагавораў ня будзе вельмі складаным, бо галоўныя пытаньні будуць вырашацца на савецка-кітайскай канфэрэнцыі, якая будзе склікана ў будучым. У Хабараўску-ж будуць абгаворвацца толькі пытаньні, зьвязаныя з надыходзячым скліканьнем канфэрэнцыі.

ЗАЎВАГА: Як вядома, скліканьне канфэрэнцыі абумоўлена фактычным аднаўленьнем статус-кво на К.-Усх. ч. у адпаведнасьці з тэлеграмай НКЗС ад 27-га лістапада, у якой пералічаны папярэднія ўмовы. Мукдэн, як вядома, гэтыя ўмовы ўхваліў.

3. Ці верныя паведамленьні прэсы аб выхадзе з пасады старшыні праўленьня К.-Усх. ч. Люй Жунь-хуана?

— Паведамленьні гэтыя верныя. Загадам мукдэнскага ўраду ад 7-га сьнежня Люй Жунь-хуан зьмешчаны з пасады.

4. Якая кандыдатура высоўваецца на пост старшыні праўленьня К.-Усх. ч.?

— Часовым старшынёю праўленьня назначаны Го Фу-мянь. Кандыдатура на пост сталага старшыні пакуль не намечана.

5. Якія адносіны мукдэнскіх улад да рускіх белагвардзейцаў, каторыя правакуюць Кітай і СССР на абвастраньне адносін?

— Калі мы можам зараз мірным шляхам вырашаць канфлікт, які стварыўся, дык толькі таму, што наш народ ніколі не адносіўся варожа да рускага народу. Кітайскі народ добра ведае, што толькі савецкі ўрад адносіцца да яго прыязна, і ня можа забыць тых дрэнных адносін, якія праяўляў да яго стары царскі ўрад.

6. Як вы адносіцеся да выступленьня дзяржаў адносна савецка-кітайскага канфлікту?

— Ноты дзяржаў зьяўляюцца прыяцельскімі, але цяпер яны беспрадметны, бо перагаворы вядуцца непасрэдна. Гэтыя перагаворы вяліся ўжо ў той час, калі ноты дзяржаў былі атрыманы.

ПРАБЫВАНЬНЕ тав. КАРАХАНА Ў ТУРЦЫІ

АНГОРА, 15. Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Дэпутат мэджылісу Махмуд зрабіў ад імя камісіі парляманту па замежных справах сьнеданьне ў гонар нам. наркома замежных спраў СССР Карахана. На сьнеданьні прысутнічалі міністар зам. спраў Тэвфік Рушдзі-бэй і члены камісіі па замежных справах.

Сёньня Тэвфік Рушдзі-бэй зрабіў ў гонар Карахана гарбату, на якой прысутнічалі асобы, каторыя суправаджаюць Карахана ў падарожжы і асабовы склад савецкага поўпрэдатва ў Анголы.

Сёньня вечарам у поўпрэдзтве СССР адбудзецца прыём».

***

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 16. У сувязі з побытам т. Карахана ў Турцыі ўвесь турэцкі друк прысьвячае артыкулы аб турэцка-савецкай прыязьні. Дэпутат Махмуд у «Міліэце» піша: «Прыезд Карахана дае нам бязьмежнае задаваленьне і радасьць. Мы ўсе памятаем, у якія сумныя і цяжкія дні нарадзіліся прыязныя адносіны паміж абедзьвюма краямі. Абодва краі пераможна скончылі пачатую барацьбу. У гэтыя гістарычныя дні мы з вялікім гонарам успамінаем аб гэтым сумленным супрацоўніцтве абодвух краёў. Падзеі і час не пахіснулі, але яшчэ мацней зьнітавалі гэтую прыязьнь, якая абярнулася ў гістарычную традыцыю. У гэтых спрыяльных абставінах дзяржаўныя дзеячы абодвух краёў з самымі шчырымі пачуцьцямі ідуць па шляху ўрэгуляваньня палітычных і эканамічных узаемаадносін».

Гадавіна Кантонскага паўстаньня ў Шанхаі

МАСАВАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАБАСТОЎКА І СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ

БЭРЛІН, 12. Як падае орган камуністычнай партыі «Ротэ-Фанэ» з Шанхая, 11-га сьнежня ў дзень гадавіны кантонскага паўстаньня ў Шанхаі на многіх прадпрыемствах была праведзена масавая палітычная забастоўка. Паміж паліцыяй і дэманстрантамі адбыліся сур'ёзныя сутычкі. Асабліва сур'ёзны характар прыняла сутычка паміж рабочымі і паліцыяй каля Паўночнага вакзала. Пляц вакзала быў заняты дэманстрантамі, якія на працягу некалькі гадзін адбіваліся ад нападаўшых паліцэйскіх.

Крывавая барацьба паміж бастуючымі гарнякамі і паліцыяй у Англіі

1 РАБОЧЫ ЗАБІТЫ, 9 ЦЯЖКА І 45 ЛЁГКА ПАРАНЕНЫХ

ЛЁНДАН, 15. Агенцтва Рэйтэр падае, што бастуючыя гарнякі сёньня напалі на паліцэйскую варту каменна-вугальных капальняў «Ротбюры». Паліцыя страляла з рэвальвэраў. Некалькі рабочых цяжка паранены. Некалькі паліцэйскіх былі паранены каменьнямі. Жорсткая барацьба паміж паліцыяй і рабочымі працягвалася звыш 20 мінут. Асабліва разгарэлася барацьба каля ўваходу ў капальню, прычым адзін гарняк забіты, 9 гарнякоў цяжка, а 45 лёгка параненых. Сярод паліцэйскіх ёсьць 6 параненых. На дапамогу паліцыі прыбылі значныя паліцэйскія сілы з Нью-Кэстля, у выніку чаго гарнякі адступілі і ў раёне капальняў новых сутычак ня было. Настрой гарнякоў узброблены. (ТАСС).

Катаржныя прысуды

ПРАГА, 10. У Кошыцы (Славакія) за распаўсюджаньне антываенных лістовак і арганізацыю сходаў, на якіх расцлумачвалася пагроза ваеннае небясьпекі, асуджаны на 8 месяцаў камуністы Цыбор Вайс. У Румаўскай Сабоце прыгавораны да году турэмнага зьняволеньня камуністы Рэвэц.

Напёт паліцыі на сход піянэраў і камсамольцаў

ПРАГА, 11. Паводле спозьненых вестак, атрыманых з Братыславы, у лістападзе паліцыя зрабіла налёт на сход піянэраў і камсамольцаў, які адбываўся ў будынку «Народнага дому». Паліцыя захапіла знойдзеныя ў памяшканьні кнігі і арыштавала каля 20 піянэраў. У паліцэйскай управе піянэраў жорстка дапытвалі. З прычыны адсутнасьці дадзеных для абвінавачаньня, арыштаваных прышлося вызваліць. Кажуць, што паліцыя прыняла сход у «Народным доме» за камсамольска-піянэрскую палітшколу.

КАТАРЖНЫ ПРЫСУД НАД КАМУНІСТЫМІ Ў ЯПОНІІ

ТОКІЁ, 15. Акруговы суд у Сапора прыгаварыў 13 камуністых, абвінавачаных у змове, да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад двух да 6-ці год. (ТАСС).

ГРАБЕЖНІЦТВА БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ

ТОКІЁ, 12. З Харбіна паведамляюць, што вайсковая часьць, прысланая для аховы канцэсій белагвардзейца Варанцова, разграбіла кантору і маемасьць служа

600.000 тон ільну і канапель дадуць асушаныя балоты БССР
Арганізацыя ільна-канаплянага трэсту ў БССР

Пяцігадовым плянам БССР намечана асушыць 540.000 гэктараў забалочаных зямель, з якіх будзе вылучаны фонд для арганізацыі дзяржаўных савецкіх гаспадарак.

Работы па асушцы Мар'інскага балота, абсьледваньні масываў па рэках Арэса, Убаралі і інш., а таксама навукова-дасьледчыя работы Менскай балотнай станцыі паказалі, што землі з-пад балот лепш за ўсё могуць быць скарыстаны для арганізацыі ільняных і канапляных саўгасных камбінатаў. Сабекошт канапель ільну на Мар'іне значна ніжэйшы, чым у іншых частках СССР. Мэханізацыя засеваў і ўборкі, правільны засеў насеньня адпаведнай якасьці значна зьніжаюць сабекошт сырцу для заводаў першапачатковай апрацоўкі.

Такім чынам, у БССР ёсьць найбольш спрыяючыя ўмовы для стварэньня на працягу бліжэйшых год вялікіх гаспадарак фабрычнага валакна на суцэльных масывах у дзесяткі тысяч і больш гэктараў. Такіх суцэльных тарфяніковых зямель у іншых частках СССР няма.

Да канца пяцігодкі мяркуецца давесьці вырошчваньне ільну і канапель на асушаных землях да 500-600 тысяч тон валакна.

Для падрыхтоўкі сырцовай базы, забесьпячэньня прамысловасьці сырцом сельска-гаспадарчых тэхнічных культур і для арганізацыі будаўніцтва заводаў першапачатковай апрацоўкі лубяных культур, прэзыдыум ВСНГ пастанавіў стварыць спэцыяльны ільна-канапляны трэст.

У абавязкі трэсту ўваходзіць арганізацыя сеткі буйных дзяржаўных прамысловых саўгасаў для вытворчасьці ільняных, канапляных і інш. лубяных культур.

Трэст павінен арганізаваць у БССР рад заводаў па першапачатковай апрацоўцы сельска-гаспадарчых тэхнічных культур. Акрамя гэтага, павінны быць арганізаваны паказальныя палі па тэхнічных культурах.

Прэзыдыум ВСНГ БССР зьвярнуўся ў ВСНГ Саюзу з просьбай аб водпуску неабходных сродкаў па ўзмацненьне мэліярацыі і будаўніцтва саўгасаў для вытворчасьці тэкстыльнага сырцу.

Да арганізацыі саўгасаў і пабудовы фабрык па першапачатковай апрацоўцы сырцу будзе прыступлена яшчэ ў гэтым годзе.

Сацыяльнае забесьпячэньне калгасьнікаў
Пры калгасах арганізуюцца страхавыя касы

Белкалгассаюз унёс у Савет Народных Камісараў БССР праект палажэньня аб арганізацыі страхавых кас для паляпшэньня матар'яльнага і культурнага становішча калгасьнікаў і іх сем'яў. Паводле гэтага праекту страхавыя касы будуць арганізаваны ў акругах, раёнах і ў буйных калгасах і куотавых аб'яднаньнях, якія налічваюць звыш 500 членаў.

Сродкі страхнас пойдуць на арганізацыю мэдычнай дапамогі калгасьнікам (пабудова лекавых устаноў, санаторый, дамоў адпачынку, дзіцячых ясьлаў і гэтак далей), на выдачу дапамогі па хваробе, цяжарнасьці і ў няшчасных выпадках, на правядзеньне санітарна-асьветнай прапаганды сярод калгасьнікаў. З гэтых-жа сродкаў будуць вылучацца фонды на забесьпячэньне інвалідаў працы, састарэлых і сірот—дзяцей членаў калгасаў.

Членамі касы могуць быць усе юрыдычна аформленыя калгасы (камуны, арцелі, т-вы па супольнай апрацоўцы зямлі). Пры ўступленьні ў члены касы калгасы ўносяць уступныя ўзносы ў разьмеры, вызначаным акруговым сходам упоўнаважаных касы. Кожны калгас—член касы кожныя тры месяцы ўносіць страхавыя (беззваротныя) узносы, норма якіх устанаўляецца таксама акруговым сходам упоўнаважаных касы.

Белкалгассаюз унёс на зацьвярджэньне СНК БССР праект палажэньня аб стварэньні пры акруговых органах сацыяльнай забясьпекі страхавых фондаў для забесьпячэньня састарэлых, інвалідаў працы і дзяцей—сірот членаў калгасаў. Паводле гэтага праекту, страхавыя фонды будуць складацца з 33 проц. страхавых узносаў, якія калгасы ўносяць у страхкасы пры калгасным сыстэме, і з сродкаў дзяржбюджэту.

Састарэлыя, інваліды працы і дзеці-сіроты членаў калгасаў будуць забясьпечвацца на аднолькавых правах з адпаведнымі катэгорыямі інвалідаў працы і сем'ямі памёршых інвалідаў працы.

Калгасы абавязаны, незалежна ад грашовага забесьпячэньня, забясьпечыць пэксіянэраў дармовым жыльлём, апаламі і прадуктамі па адпускных цэнах, якія існуюць для членаў калгасаў.

200 работніц-камуністак у калгасы

Жанаддзел ЦК КП(б)Б узьняў пытаньне аб мабілізацыі 200 работніц-камуністак для пасылкі ў калгасы Беларусі. Работніцы-камуністкі пройдуць кароткатэрміновыя курсы.

У калгасах камуністкі будуць весьці работу па арганізацыі жаночага актыву, узмацненьні работы дэлегацкіх сходаў і г. д. Мабілізаваныя работніцы пасылаюцца ў калгасы на 1-1½ месяцы. Каапрацыйныя арганізацыі арганізуюць спэцыяльны фонд па аплаце выдаткаў, зьвязаных з мабілізацыяй работніц-камуністак у калгасы. Апрача таго ў лік 500 рабочых, якія накіроўваюцца ў калгасы, увойдзе 15 проц. жанчын.

Аб разьмеркаваньні штрафных сум,
спагнаных за парушэньне пастаноў сельскіх сходаў аб выкананьні пляну хлебазагатовак ЦВК і СНК СССР пастанаўляюць

1) Штрафы, якія спаганяюцца з пасобных гаспадарак за парушэньне на станоў сельскіх сходаў аб выкананьні пляну хлебазагатовак, разьмяркоўваюцца наступным чынам:

а) 25 проц. адлічаюцца ў асобныя фонды пры мясцовых выканаўчых камітэтах для выдачы адначасовае беззваротнае дапамогі асобам і гаспадаркам, якія пацярпелі ад кулацкага гвалту;

б) 25 проц. адлічаюцца ў фонды каапэраваньня і калектывізацыі вясковае беднаты і батрацтва;

в) 50 проц. і залічваюцца па спэцыяльны бягучы рахунак НКФ СССР у Дзяржбанку і ідуць на ўзмацненьне фінансаваньня жывёлаводзтва і гандлёвага будаўніцтва.

2) Гэтыя пастановы пашыраецца на ўсе штрафы, спагнаныя пасьля 1-га ліпеня 1929 г.

Адлічэньня ў агульна-саюзны бюджэт са штрафных сум, выдаткаваных да выданьня гэтае пастановы, павінны быць адлічаны да 1-га лютага 1930 г. за кошт іншых мясцовых прыбыткаў. Парадак адпраты ўстанаўляецца НКФ СССР.

3) Прапанаваць урадам саюзных рэспублік унесьці ў заканадаўства саюзных рэспублік зьмены, якія выцякаюць з гэтае пастановы.

Старшыня ЦВК СССР КАЛІНІН.
Старшыня СНК СССР РЫКАЎ.
Сэкратар ЦВК СССР ЕНУКІДЗЭ.

Сьмілаўшчына---раён суцэльнай калектывізацыі

Апошні пленум акрвыканкому вызначыў Сьмілавіцкі раён раёнам суцэльнай калектывізацыі.

Да гэтага часу ў Сьмілаўшчыне аб'яднана ў калгасы 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Да часу веснавой пасеўнай кампаніі ўсе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі раёну павінны быць цалкам калектывізаваны. У сувязі з гэтым прэзыдыум Менакрвыканкому зацьвердзіў цэлы рад мерапрыемстваў па калектывізацыі Сьмілаўшчыны.

Прэзыдыум АВК прапанаваў райвыканкому і калгассаюзу вызначыць куставыя аб'яднаньні калектыўных гаспадарак. Плошча кусту вызначана ў 10.000 гэкт.

Склад агранамічнага пэрсаналу ў Сьмілаўшчыне павялічваецца на 5 чалавек, якія будуць накіраваны для працы ў куставыя аб'яднаньні.

Да 1-га сакавіка Калгассаюзам і Белсельтрэстам будуць арганізаваны ў раёне дзьве трактарныя калёны.

Райвыканкому, Калгассаюзу і Крэдсаюзу даручана на працягу сьнежня рэарганізаваць усе віды сельска-гаспадарчай каапэрацыі ў раёне ў калгассыстэму арганізацыяй райкалгассаюзу.

Пастаўлена пытаньне перад Наркамасьветы аб рэарганізацыі ў гэтым навучальным годзе Дукорскай сямігодкі і школу па падрыхтоўцы кадраў сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

Райвыканкому прапанавана забясьпечыць своечасовую арганізацыю насеннага фонду для поўнага засеву правог кліну.

Прапанавана райвыканкому перабудаваць працу ўсіх устаноў у раёне, выходзячы з асноўнай задачы суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі раёну. Усе ўсага ўстаноў раёну павінна быць зьвернута на поўнае забесьпячэньне калгасбудаўніцтва, на жорсткую барацьбу з кулацкім і варожым элемэнтам, на выразнае правядзеньне клясавай лініі працы ўсіх устаноў, асабліва ў сельсаветах.

Дастойны адказ буржуазнай хлусьні аб эміграцыі немцаў з СССР

ПАКРОЎСК, 14. У рэдакцыі мясцовых газэт штодня паступаюць шмагкінія лісты ад нямецкіх сялян і пастановы бядняцка серадняцкіх сходаў, у якіх заяўляецца, што беднякі і сераднякі ня толькі ня думаюць выяжджаць за граніцу, усім сялом уступіць у калгас. Сялянін Маркштацкага кантону пасылаюць у нямецкую газэту «Нахрыхтэн» лісты со іх сваякоў, каторыя пражываюць у Нямеччыне і Амэрыцы, у якіх тыя пішуць хлусьню аб эміграцыі немцаў з СССР.

Польскія фашыстыя ў Бэльгіі

ПАРЫЖ, 14. Орган Бэльгійскае кампартыі «Драпо Руж» («Чырвоны Сьцяг») зьмясьціў вялікі артыкул, у якім выкрывае правакацыйную дзейнасьць польскага пасольства ў Бэльгіі. Гаэта падае рад фактаў, якія гавораць аб тым, што польскае пасольства пад апякунствам бэльгійскага ўраду ўзмоцнена пасаджае ў Бэльгіі фашыстыя арганізацыі.

Пры актыўным садзейнічаньні польскага консульства і бэльгійскіх улад, у Бэльгіі створана «Польская антыкамуністычная ліга ў Бэльгіі». Гэта арганізацыя ставіць сабе мэтай узмоцненую барацьбу з камуністымі і «левымі элемэнтамі» і імкнецца выратаваць «польскіх рабочых ад шкоднага ўплыву агентаў Масквы». Дзейнасьць гэтай арганізацыі накіравана ў першую чаргу супроць польскіх палітэмігрантаў-антыфашыстых.

Дзейнасьць «Антыкамуністычнай лігі» выяўляецца ў тым, што яна арганізуе брыгады штрэйбрахераў, пасылае на прадпрыемствы шпіёнаў і хадайнічае аб высылцы з Бэльгіі рабочых. Ня траба і гаварыць, што тыя польскія антыфашысцкія дзеячы, якія на хадайніцтве «Антыкамуністычнай лігі» высылаюцца з Бэльгіі ў Польшчу, на бацькаўшчыне арыштоўваюцца і кідаюцца ў турмы на доўгія тэрміны. Па выхадзе-ж з турмы іх чакае беспрацоўе, голад...

Устаноўлена, што кіраўнікі і «актывісты» «Антыкамуністычнай лігі» выконваюць ролю шпіёнаў і даносчыкаў бэльгійскай «сюрэтэ» (ахранкі). Па хадайніцтве кіраўнікоў лігі з Бэльгіі высланы не адзін дзесятак праціўнікаў фашызму.

«Драпо Руж» падае рад прыкладаў, якія навочна ілюструюць правакацыйную дзейнасьць пілсудчыкаў у Бэльгіі. Напярэдадні 1-га жніўня (міжнароднага чырвонага дня) кіраўнікі лігі і супрацоўнікі польскага консульства зьявярнуліся да бэльгійскіх улад з прапановаю высылаць з Бэльгіі каля 20 польскіх рабочых, актыўных прафсаюзных работнікаў і групу студэнтаў, западозраных у сувязі з бэльгійскімі камуністамі. Гэтая прапанова пакінуць межы краю. У часе нядаўняй забастоўкі гарнякоў у Шарлеруа польскія фашыстыя паклапаціліся аб высылцы раду польскіх рабочых, якія прымалі актыўны ўдзел у забастоўцы. Адначасова пры пасярэдніцтве польскага пасольства і са згоды бэльгійскае ўлады з Польшчы былі запрошаны штрэйкбрэхэры.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб цесным супрацоўніцтве паміж польскімі фашыстымі, бэльгійскаю ўладаю і капіталістымі. Бэльгійскі ўрад, які заяўляе, што не дапусьціць «ніякай палітычнай дзейнасьці» з боку чужаземцаў, прытрымліваецца гэтага правіла толькі тады, калі мова ідзе аб левых антыфашысцкіх арганізацыях замежных эмігрантаў. Але, калі ўзмоцненую палітычную дзейнасьць разгортваюць фашыстыя, у даным выпадку польскія, дык бэльгійскі ўрад ня толькі не заклікае іх да парадку, але наадварот, дае ім усялякую дапамогу. (ТАСС).

Як Румынія „разбройваецца"

Вайсковы бюджэт бягучага году значна павялічаны (у 1929 годзе складаў 7.930.500 лей).

Між іншым, як падае румынскае агенцтва «Радор», у радзе міністраў быў зроблены даклад аб стварэньні морскай базы румынскага флёту ў Чорным моры.

Непасрэдна для армі, як падае газэта «Лупта», мяркуецца закупіць навейшую ўдасканаленую тэхнічную маемасьць. Пасьля манэўраў вырашана ўзмацніць і ўмацаваць паветраны флёт.

Узмоцненая ўвага зварачаецца на пабудову і абсталява

Н. К. Крупская

Чуцён мерны крок рабочых батальёнаў*)

Усе тыя задачы, якія былі пастаўлены ў пачатку рэвалюцыі, паўстаюць і зараз, але на зусім новай аснове. У свой час быў выдан рад дэкрэтаў, на падставе якіх была праведзена поўная работа. Але тады ня было яшчэ магчымасьці надаць гэтай рабоце той размах, які патрэбен для таго, каб зрабіць каронны пераварот ва ўсім нашым жыцьці.

Возьмем такі прыклад. Быў выдан рад законаў, якія вызваляюць і разьвіваюць жанчыну. І вось на працягу 12 год дзейнічалі гэтыя законы, але яны да канца яшчэ жанчыну не разьняволілі. Роўнасьць мужчыны і жанчыны перад законам, аб якой гаворыць наша канстытуцыя, — гэтага разьняволеньня жанчыны яшчэ не створана. Праведзена вялікая работа, але цяпер, калі прыходзім на жаночы сход і чуем, як выступаюць жанчыны, адчуваем, што стварацца нейкая асноўная база, на якой гэтае пытаньне вырашана, адчуваем, што замацуе стары быт, стары грамадзкі ўклад.

Узяць, напрыклад, такое пытаньне, якое зараз мае вялізарнае значэньне — пытаньне аб калектывізацыі. Мы толькі зараз падыходзім да масавай калектывізацыі грамадзкай зямлі. Толькі зараз пры масавай калектывізацыі магчыма грамадзкае асваеньне масамі зямлі.

Таксама абстаіць справа з фабрыкамі, заводамі і прадпрыемствамі. Гэтае пытаньне было пастаўлена так: фабрыкі і заводы перадаюцца ў грамадзкую ўласнасьць. Але мы ўсе памятаем, як у першы час часта тлумачылі гэты факт. Я памятаю, як на адной фабрыцы рабочыя і работніцы пастанавілі працаваць на 2 гадзіны менш: «Колькі захочам, гаворацъ, столькі і будзем працаваць: мы гаспадары»... Мабыць, у першы час гэта было няўхільна. Але зараз, калі будаўніцтва прамысловасьці набывае такі вялізарны размах, цяпер мы разумеем, што такі падыход немагчымы, што ён наіўны, што зараз падыход з боку рабочых павінен быць іншы, што ўся справа ў тым, каб рабочая маса паграмадзку асвоіла гэтыя фабрыкі і заводы, адчула сябе сапраўдным гаспадаром гэтых прадпрыемстваў, стала клапаціцца аб іх, як аб сваіх. Цяпер вядзецца вялізная напружаная работа па ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы. Гэта работа зьвязана з пад'ёмам унутранай сьвядомай дысцыпліны, якую ўзмацняюць рабочыя брыгады. Што гэта азначае? Гэта азначае, што мы падыходзім да таго часу, калі пастанова аб тым, што фабрыкі і заводы пераставаць быць прыватнай уласнасьцю і становяцца ўласнасьцю грамадзкай, гэта перастае ўжо быць толькі заканадаўчым актам, а пытаньне ставіцца значна глыбей — рабочыя пачынаюць калектыўна асвойваць вытворчасьць, **становяцца сапраўднымі калектыўнымі гаспадарамі вытворчасьці.**

Ставіцца рад пытаньняў: аб сьвядомай дысцыпліне, аб напружанасьці работы, аб лепшай арганізацыі і рацыяналізацыі ўсёй працы, і тое, што гэтыя пытаньні ставяць самі рабочыя, што яны праводзяць добраахвотна вялізарную часта гэрайчную работу па ўзьнятьці вытворчасьці — гэта ў корані зьмяняе стары лад. Мы пачынаем адчуваць, як наш лад, пераходны ад капіталізму да сацыялізму, усё больш і больш робіцца яснасна іншым ладам, значна больш сацыялістычным ладам, чым мы гэта сабе калі-небудзь уяўлялі. Раней мы сабе вельмі слаба ўяўлялі, як будзе адбывацца гэтае «асваеньне» грамадзкай уласнасьці, гэта масавая калектывізацыя сельскае гаспадаркі, мы не маглі сабе ўявіць, як рабочыя брыгады возьмуць у свае рукі вытворчасьць, як яны падыйдуць да гэтага пытаньня і пачнуць паводаму яго вырашаць. Усё гэта мае вялізнае значэньне.

Я гэтымі днямі перачытала брашуру т. Леніна: «Чарговыя задачы савецкай улады». Напісана яна была ў канцы красавіка 1918 г. Але, калі чытаеш гэту брашуру зараз, адчуваеш, што яна напісана быццам на сёнешні дзень. Усе тыя вялікія пытаньні, якія стаяць зараз, пытаньні аб тым, каб рабочая клясa пашырыла свае функцыі, каб яна вылучыла кадр вылучэнцаў у апарат, пытаньне аб паліжэньні рабочых да кіраўніцтва, аб арганізацыі рабочага кантролю, вуюце праведленай работы, пытаньне аб выпрацоўцы новых форм калектыўнае працы, пытаньне аб унутранай сьвядомасьці, дысцыпліне, новых адносінах да вытворчасьці, — усе гэтыя пытаньні там узьняты і пастаўлены на ўвесь рост.

Уладзімер Ільліч гаварыў: асобныя труднасьці ёсьць і а прычыны гэтых труднасьцей ёсьць усякае нявер'е, нявер'е ў магчымасьць перамагчы гэтыя труднасьці, ёсьць нэрвавае, гаварыў ён: **«Нам не патрэбны гістэрычныя парывы, нам патрэбен мерны крок рабочых батальёнаў».**

Зьезд ударных брыгад можна кваліфікаваць з гэтага пункту погляду. На гэтым зьезьдзе ўже чуцён гэты «мерны крок рабочых батальёнаў».

*) З прамовы на 1-м усесаюзным зьезьдзе ўдарных брыгад.

Нямеччына напярэдадні новых клясавых баёў

Аб тым, што эксплёатацыя рабочых у Нямеччыне за апошнія гады ўзмацнілася за многа раз, прыходзіцца чуць вельмі часта. Нядаўні зьезд рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыі прайшоў пад лёзунгам барацьбы з гэтай эксплёатацыяй.

Усе гэтыя скаргі на ўзмоцненае націскальне капіталістычнае рацыяналізацыі на рабочую клясу набываюць асабліва яскравую рэчаіснасьць і павочнасьць толькі ў сьвятле канкрэтных лічбовых і фактычных даных, апублікаваных у прэсе за апошні час.

Набыцьцё фірмаю Круп вялікіх мэталёвых заводаў у Дзюсэльдорфе толькі для таго, каб зачыніць іх; звальненьне 7.000 дакераў у Брэмэне, масавыя скарачэньні рабочых на заводах Крупа; весткі аб звальненьнях рабочых ва ўсіх галінах прамысловасьці — вось знадворны бок становішча. **Кожны тыдзень усё новыя і новыя дзесяткі тысяч рабочых пазбаўляюцца куска хлеба.** Ня гледзячы на гэта вялізарнейшае скарачэньне рабочых, вытворчасьць **зусім не зьмяншаецца.** Наадварот, яна трымаецца на ранейшым узроўні і нават некалькі павышаецца шляхам узмоцненае эксплёатацыі рабочых, якія пакінуты на прадпрыемствах.

Гэтае ўзмоцненае націскальне капіталістых на пралетарыят ідзе побач:

1) **з узмоцненым ростам канцэнтрацыі банкаўскага і прамысловага капіталу,**

2) **са зьмяншэньнем норм сацыяльнага страхаваньня і звужэньнем кола застрахаваных і**

3) **з нязвычайным узьняцьцем прадукцыйнасьці працы.**

Канцэнтрацыя капіталаў знаходзіць сваё выяўленьне як у зьліцьці двух буйнейшых банкаў Нямеччыны, каторае адбылося некалькі месяцаў таму назад, пры якім было звольнена звыш 7.000 служачых, так і ў скупляньні буйнымі канцэрнамі больш дробных прадпрыемстваў з тым, каб аусім зачыніць іх і каб узмоцненая эксплёатацыя рабочых асноўных прадпрыемстваў канцэрну дала таксама тыя вялізэнныя сродкі якія трацяцца на набыцьцё новых.

Капітал трэстаў і банкаў даволі безсэрамонна праводзіць свае бязьлітасныя мерапрыемствы, якія кідаюць у надзвычай жорсткую галечу ўсё новыя дзесяткі тысяч рабочых і служачых. Каралі банкаў і прамысловасьці таму імённа гэтак і бесцэрамонны, што **ім дапамагае і ахоўвае іх інтарэсы сацыял-фашысцкая прафбюракратыя.**

У той-жа час становішча рабочых і служачых, выкінутых за борт прадпрыемстваў, вельмі крытычнае. Паводле пачыну і настойлівасьці Гільфэрдынга, дапамога беспрацоўным нядаўна скарочана і кола застрахаваных значна звужана. У гэтых адносінах **сацыял-фашыстыя лішні раз аказаліся вернымі слугамі і дапаможнікамі эксплёататарскіх клясс.**

Зусім бесцэрамоннымі і цынічнымі зьяўляюцца мэтады прадпрыемцаў у галіне рацыяналізацыі. Рэшта меры ў першую чаргу накіраваны ў бок амалажэньня рабочае сілы шляхам заменды працы «старых» рабочых жаночай і дзіцячай працай, а таксама замены кваліфікаваных рабочых некваліфікаванымі. Далейшай мерай узмоцненьня эксплёатацыі працы служыць асобная сыстэма заахвочваючай (прэміяльнай) зарплаты. Пры гэтай сыстэме звычайная зьдзельшчына асабліва «ўдасканалена». Грабежніцкім спосабам выціскаюцца апошнія соікі з рабочага. Дзякуючы гэтай прэміяльнай сыстэме дасягнуты, напрыклад, наступныя нячуваныя вынікі: хэмічны трэст за апошні час звольніў звыш 7.000 рабочых з ліку 92.000 і намеціў да разьліку яшчэ некалькі тысяч рабочых. У той-жа час вытворчасьць трэсту меркуецца нават крыху пашырыць. Тыя-ж рабочыя, якія застаюцца на працы павінны поўнасьцю і нават з лішкаю даць выпрацоўку і за сябе, і за звольненых.

Яшчэ больш зьдзіўляючыя вынікі рацыяналізацыі ў каліевай прамысловасьці, дзе без скарачэньня агульнай вытворчай праграмы зачынена 156 прадпрыемстваў і з 48.000 рабочых пакінута толькі 21.000, а лік служачых з 4.600 зьведзены да 2.500 чал. Без колькі-небудзь істотных тэхнічных удасканаленьняў **патроена здабыча, якая прыпадае на аднаго рабочага.**

Прыкладам падвойнае эксплёатацыі можа паслужыць факт, паданы з Эрфурту, дзе на аднэй а абутковых фабрык у 1926 годзе была ўведзена канвэерная сыстэма вытворчасьці. Нядаўна на гэтай фабрыцы канвэер быў зьняты і ўстаноўлена новая «урочная» сыстэма). Урок устанаўляецца інструктарам (яго там называюць канцёрам), які сам працуе па павышанай норме пару тыдняў. Гэтая норма ўстанаўляецца ў якасьці «уроку» абавязкова для ўсіх рабочых і работніц. Для паасобных апэрацый выпікі новае сыстэмы зусім зьдзіўляючыя: да ўвядзеньня канвэеру «норма» складала 250-300 пар, пры канвэеры — 300-350 пар, а пры новай «урочнай» сыстэме — 500 пар.

Паказальны таксама даны рамонтных чыгуначных майстэрань, дзе на адзін і той-жа рамонт паравозу ў 1926 г патрабавалася 42 дні, а зараз усяго 17 дзён.

Бязьлітасная капіталістычная рацыяналізацыя ў Нямеччыне прывяла да таго, **што за год лік беспрацоўных у Нямеччыне ўзрос больш, чым на 300.000 чал.** (у жніўні 1929 г. 1.476.000 супроць 1.152.000 у жніўні 1928 г.).

Гэты рост ліку беспрацоўных пакуль яшчэ ня зьвязаны са скарачэньнем вытворчасьці і з прамысловым крызісам, які хаця і надыходзіць у Нямеччыне, але пакуль яшчэ непасрэдна не адчуваецца

Ёсьць яшчэ падставы меркаваць, што рост беспрацоўя далёка яшчэ не дасягнуў свайго вышэйшага пункту. Наадварот, усе даныя гавораць за тое, што **беспрацоўе ўзрасьце яшчэ больш.**

Гэтае становішча няўхільна вядзе да далейшага абвастрэньня клясавае барацьбы і да далейшага рэвалюцыянізаваньня пралетарскіх мас. Пад кіраўніцтвам Нямецкае кампартыі і праз рэвалюцыйную прафаназыцыю рабочыя масы ўцягваюцца ў жорсткую барацьбу з усё наглевэчаю клясаю прадпрыемцаў і яе сацыял - фашысцкімі прыслужнікамі і нахлебнікамі.

Надыходзіць суцэльная паласа клясавых баёў супроць капіталістычнай рацыяналізацыі супроць масавага звальненьня і скарачэньня рабочых, супроць узмоцнёнай эксплёатацыі працоўных, супроць сыстэматычнага пагоршаньня жыцьцёвага ўзроўню рабочых і далейшага зьніжэньня іх рэальнае зарплаты.

А. ВІЛЬ.

ПЕРШЫ У СССР АГРАГОРАД

Будаўніцтва гораду пачнецца ў 1929-30 годзе ў Хоперскай акрузе

У Маскве пачаліся работы па праектаваньні першага ў СССР аграгораду, які вырашана пабудаваць у Бударынскім раёне, Хоперскай акругі.

Аграгорад у сваёй культурна-бытавой арганізацыі нічым ня будзе адрозьнівацца ад сацыялістычных гарадоў. Будуць пабудаваны новыя жыльлёвыя камбінаты, усё харчаваньне насельніцтва будзе сканцэнтравана ў харчовым камбінаце і г. д. Па праекце цэнтрам гораду будзе энэргэтычная база (машына-трактарная станцыя), вакол якое будуць пабудаваны часьць жылькамбінатаў, створаны культурныя ўстановы, а таксама прадпрыемствы па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў і інш.

Эскізны праект аграгораду будзе гатовы ў пачатку студзеня 1930 г. Будаўніцтва аграгораду пачнецца ў 1929-30 г., калі будзе прыступлена да пабудовы жылькамбінатаў, а таксама харчовага камбінату першае чаргі, разьлічанага на абслугоўваньне 15.000 чалавек.

Нафта на паўночных склонах Уралу

ЛЕНІНГРАД, 15. Нафтавы інстытут атрымаў паведамленьне ад кіраўніка геалёгіч прысковых работ на заходніх склонах Уралу аб тым, што ва многіх пунктах спатканы яўныя адзнакі нафтаноснасьці. У прыватнасьці, асабліва яскрава выкрыта нафтаноснасьць у ранёне ракі Беразані і на склонах паўночнага Уралу, дзе ў бліжэйшы час пачнуцца сьвідравальныя работы.

СССР будзе першай дзяржавай у сьвеце па мэталюргіі

ЛЕНІНГРАД, 15. Закрылася першая міжнародная канфэрэнцыя па абагачэньні руд. Вядомы нямецкі вучоны праф Бюст, які выступаў на канфэрэнцыі заявіў, што СССР стане ў бліжэйшыя гады першай краінай у сьвеце па мэталюргіі.

Шчасьлівыя нумары

МАСКВА. 15-га сьнежня адбыўся **3-ці тыраж выйгрышаў дзяржаўнае ўнутранае пазыкі 1929 году.** Выйгрыш у 100 тысяч руб. прыпаў на аблігацыю № 01, серыя № 0129. Выйгрыш у 50 тыс. руб. прыпаў на аблігацыю № 41, серыя N. 6558. (ТАСС).

ВЫКРЫТЫ НАДЗВЫЧАЙ БАГАТЫЯ МЕСЦАНАРАДЖЭНЬНІ ФАСФАРЫТАЎ

Старшыня праўленьня трэсту «Фасфарыт» т. Аляксееў паведаміў, што ў раёне Вольска (Н. Волская вобл.) выкрыты месцанараджэньні магутных высокагатункових фасфарытаў.

Запасы фасфарытаў азначаюцца тут мільярдамі тон і па сваёй магутнасьці і якасьці падобны да славутых маракан скіх фасфарытаў, якія імпартуюцца усімі эўрапэйскімі краямі.

Паводле загаду старшыні ВСНГ РСФСР т. Лобава, створана спэцыяльная камісія пад старшынствам члена прэзыдыуму тав. Карасташэўскага, якой запрапанавана безадкладна выехаць у Саратаў для вывучэньня пытаньня аб пробнай эксплёатацыі месцанараджэньня. Разам з ужо працуючымі на месцы камісіяй НТУ ВСНГ і прафэсарамі саратаўскага унівэрсытэту камісія ВСНГ прыступіць да дэталёвых разьведак і далейшага вывучэньня месцанараджэньня.

ПРАВЕРКА ПРАЛЕТАРСКІХ КАДРАЎ ПАРТЫІ

Генэральная чыстка яшчэ больш узмацняе авангард пралетарыяту, яшчэ больш узьнімае баяздольнасьць бальшавіцкіх радоў для разгорнутага сацыялістычнага наступленьня

Максымальна ўзмацніць увагу да праверкі і чысткі вытворчых парт'ячэек

Асноўныя задачы ня выкананы

У практыцы ячэйкі КП(б)Б **наўбасной** фабрыкі **Белмясгандлю (Менск)** маюць месца хваравітыя зьявы і факты парушэньня партыйнай дысцыпліны і скажэньня лініі партыі. Праверка ячэйкі, якая пачынаецца зараз, паліпша выкрыцьць усе гэтыя зьявы і аздаравіць партыйную ячэйку.

Кіраўніцтва ячэйкай недаацаніла ролі партыйнай ячэйкі ў агульным жыцьці прадпрыемства, не мабілізавала ячэйку на выкананьне асноўных задач партыі па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, узмацненьні барацьбы з вытворчай нідбайнасьцю, палітычнай прадукцыйнасьці працы на вытворчасьці і г. д.

Ня дзіва, што бюро ячэйкі, займаючыся ў большай меры справамі асобных партыйцаў, прайшло міма буйных недахопаў і сур'ёзных памылак у вытворчым жыцьці фабрыкі і гаспадарчым кіраўніцтве. На фабрыцы маюць месца вялікія вытворчыя недахопы. Якасьць прадукцыі яшчэ вельмі нізкая. Перашкоды, якія тармозяць разьвіцьцё фабрыкі, яшчэ ня зьнішчаны. Апарат фабрыкі засьмечаны чужымі элементамі. У асобных выпадках было дапушчана яўнае скажэньне правільнай лініі (сувязь з прыватчыкамі). На прадпрыемствах, якія абслугоўваюцца ячэйкай, ёсьць факты безгаспадарчасьці, слабой прапоўнай дысцыпліны, рвацтва і г д. Асобныя адміністрацыйныя работнікі на прадпрыемстве зацісканы самакрытыку. На гэта бюро ячэйкі зусім не рэагавала, што моцна адбілася на разгортваньні крытыкі і самакрытыкі на фабрыцы і ў самой ячэйцы. Наогул бюро не зьвярнула ўвагі на выкананьне дырэктыў аб самакрытыцы.

Гэтыя недахопы і прарывы ў практычнай рабоце ячэйкі перашкаджалі росту ячэйкі і вярбоўцы новых кадраў рабочых у рады партыі. Калі ў мінулым годзе ў партыю былі ўцягнуты 7 рабочых, то за апошні час у сувязі з вышэйадзначанымі недахопамі і памылкамі вярбоўка зусім заняпала. Ячэйка за апошнія месяцы не завербавала ў партыю ні аднаго рабочага, ня гледзячы на тое, што лік рабочых на прадпрыемстве павялічыўся ў тры разы. Трэба адзначыць, што росту ячэйкі значна перашкаджаюць бюракратычныя адносіны да гэтае справы бюро ячэйкі і сакратара. Бюро вельмі нядбайна адносілася да арганізацыйнага абармаленьня заяў рабочых аб прыёме іх у рады партыі. Падамо невялікі, але характэрны факт. Яшчэ вясной 1929 году два рабочыя з вялікім вытворчым стажам падалі заяву аб прыёме іх у рады партыі. Бюро ячэйкі і агульны сход аднагалосна прынялі гэтых рабочых у партыю. Потым заявы рабочых каля шасьці месяцаў марнаваліся ў бюро ячэйкі. Аднаго з гэтых рабочых, тав. Васілеўскага, нарэшце, так і не прынялі ў партыю, бо неўзабаве сакратар ячэйкі патрабаваў ад т. Васілеўскага запаўненьня карткі і паручэньняў, ставячы ў ячэйцы думку, што т. Васілеўскага ўсёроўна не зацьвердзяць у партыйнай раённай камітэт КП(б)Б. І ўсё гэта робіцца праз 6 месяцаў пасьля зацьвярджэньня гэтага таварыша на бюро ячэйкі і агульным партыйным сходзе.

Таксама на фабрыцы мелі месца буйныя прарывы ў прафэсыянальнай рабоце. Фабрычны камітэт за бязьдзейнасьць і памылкі распушчаны. Сацыялістычнае спаборніцтва на фабрыцы праводзіцца фармальна.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што партыйнае кіраўніцтва фабрыкі ня здолела выканаць рад ускладзеных на яго важнейшых палітычных задач. Нават да чысткі партыі ячэйка не падрыхтавалася, як належыць. Інструкцыі ЦКК УсеКП(б) аб чысткі партыі ня толькі не прапрацавана сярод камуністых, але і не папулярызавана сярод беспартыйных рабочых. Чыстка ячэйкі павінна поўнасьцю выявіць сапраўднае становішча ячэйкі і аздаравіць яе.

В.

АГІТПРОП ЦК КП(б)Б паведамляе, што апошні тэрмін падачы заяў і даку мантаў на падрыхтоўчае і асноўнае адз. ІНСТЫТУТ ЧЫРВОНАЙ ПРАФЭСУРЫ—20 сьнежня.

Агітпроп ЦК КП(б)Б паведамляе, што, згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, на завочныя курсы марксызму пасылаюцца наступныя т. т.

1. Лубаж, 2. Лазоўскі, 3. Пасюкевіч, 4. Жукаў, 5. Ляўкоў, 6. Матулайціс, 7. Бялуга, 8. Сасноўскі, 9. Ярмоў, 10. Цыгульчык, 11. Раманчук, 12. Пятункоў і 13. Ісаяў.

ПАТРЭБЕН ПЕРАЛОМ

Пленум кастрычніцкага РК КП(б)Б аб акадэмічнай рабоце Белдзяржунівэрсытэту

Гэтымі днямі на пленуме Кастрычніцкага РК КП(б)Б быў заслуханы даклад тав. Каранеўскага аб стане акадэмічнай працы ў Белдзяржунівэрсытэце. Таварышы, якія выступалі ў спрэчках, завастрылі сваю ўвагу на патрэбнасьці **стварыць пералом у адносінах прафсаюзу і ўсяго студэнцтва да акадэмічнай работы.**

Пытаньні ўзьняцьця прадукцыйнасьці працы, барацьбы за рацыяналізацыю студэнцкага жыцьця, вышэйшыя прагулаў і г. д. выклікалі ажыўленае абгаварэньне. Справа ў тым, што да гэтага часу унівэрсытэт у гэтых адносінах ідзе далёка ззаду нашай вытворчасьці. Зьявішчы, з якімі пакончана ў жыцьці нашай прамысловасьці некалькі год таму назад, ва унівэрсытэце яшчэ далёка ня зжыты. Прычынай гэтаму зьяўляецца неразуменьне таго, што **праца ў Белдзяржунівэрсытэце зьяўляецца такой жа, як і праца на вытворчасьці.** Напрыклад, у часе работ Менскага аўзьезду ўдарных брыгад райкомам ЛКСМБ была арганізавана дэманстрацыя ў гонар зьезду, у якой павінны былі прыняць удзел і камсамольцы - студэнты ВДУ. Камсамольскі калектыў ВДУ, такім чынам, быў адарваны ад заняткаў. Бязумоўна, што такія адносіны выклікаюць зрыў усёй вучобы на той ці іншы тэрмін, а таксама зьяўляюцца па сутнасьці **зьдзекам над самой ідэяй ударництва.**

Пленум РК аддаў шмат увагі пытаньням арганізацыі вытворчай практыкі. Паказалася на рад такіх фактаў, калі студэнты, што пасылаліся на практыку, выкарыстоўваюцца не па прызначэньні, што бязумоўна ня можа навучыць іх працы. Быў нават такі абурачы выпадак, калі Крымвышук, выкарыстоўваючы студэнтаў - практыкантаў, пасылаў іх... лавіць на вуліцах бяспрытульных, адшукваць тых людзей, што пакралі курэй ды качак. Далей такіх адносін проста ісьці нельга. Органы Наркамюсту студэнтам, што адбываюць у іх практыку, даюць тэхнічную работу — перапісваньне розных паперак, напісаньне адносін «за № такім і такім». Або яшчэ абурачы факт. Ня гледзячы на пастановы Наркампрацы, да гэтага часу па радзе ўстаноў не праведзена аплата практыкантаў, не ўрэгулявана таксама пытаньне аб вызваленьні служачых студэнтаў для прахаджэньня практыкі.

У сучасны момант знаходзіцца ў надзвычайна цяжкім становішчы падпрактыка студэнтаў ВДУ. Улічваючы гэта, пленум РК зьвярнуў увагу Наркамасьветы ў бок таго, каб апошні цалкам забясьпечыў практыкантаў такімі ўмовамі, пры якіх яны змаглі-б даць узоры сапраўды паказальнай работы, а таксама, каб быў дан рад дадатковых школ для практыкі.

У сувязі з хутчэйшай падрыхтоўкай кадраў выплывае патрэбнасьць скарачэньня тэрміну навучаньня ва унівэрсытэце. Умовай для гэтага пленум лічыць перавод унівэрсытэту на бесьперапынны навучальны год.

На пленуме ўзьнікла таксама пытаньне аб **патрэбнасьці зьмены форм кіраўніцтва БДУ.** Для таго, каб дабіцца пераломy ў працы унівэрсытэту, зьмены тэмпаў працы, пленум лічыць патрэбным паставіць пытаньне аб **рэарганізацыі сыстэмы кіраўніцтва БДУ** ў бок увядзеньня адзіначаньня, пераняцьня цэнтру цяжару работы і кіраўніцтва на ніжэйшыя зьвяньні БДУ (асобныя аддзяленьні факультэтаў), зьнішчэньня прамежных інстанцый паміж рэктарам БДУ і яго намесьнікам, з аднаго боку, і незьмянымі зьвяньнямі БДУ — з другога.

Для ўзмацненьня сувязі унівэрсытэту з пралетарскай масай гораду паводле пастановы пленуму РК будуць прыцягнуты ў кіраўнічыя органы унівэрсытэту рабочыя ад варштату, прадстаўнікі буйнейшых фабрык і заводаў Менску. Для гэтае-ж мэты трэба, каб дапаможныя факультэты і аддзяленьні БДУ былі прымацаваны да заводаў для іх культурнага абслугоўваньня, прычым партарганізацыі гэтых заводаў павінны быць у курсе работ факультэтаў, якія да іх прымацаваны.

Пленум райкому не абышоў таксама пытаньня аб зьмене навуковых кадраў. Шмат спрэчак выклікала пытаньне аб перагрузцы асьпірантаў пэдагагічнай і грамадзкай работай, якая пагражае зрывам **усёй работы па іх падрыхтоўцы.** Цэлы рад савецкіх органаў, а таксама і партыйных зьмяшаюць асьпірантаў і ардынатараў клінік з працы без узгадненьня з кіраўнічымі органамі унівэрсытэту. Пленум вызначыў рад практычных мер для зьнішчэньня гэтага зьявішча.

Даклад рэктара БДУ тав. Каранеўскага зьяўляецца першым выпадкам, калі пытаньне аб унівэрсытэце ставіцца ў такім кіруючым партыйным органе, як пленум РК КП(б)Б. Пры сучасным надзвычайна вялікай увазе партыі да кадраў патрэбна, каб раённыя камітэты і АК КП(б)Б больш увагі аддавалі працы нашых навучальных устаноў, у прыватнасьці БДУ, і больш кіравалі імі.

Першая практыка абгаварэньня стану акадэмічнай працы БДУ на пленуме цалкам сябе апраўдала, і пастановы пленуму будуць вялікім штуршком уперад у працы кіраўнічых органаў з студэнцкай масай БДУ.

М.

КАШТОЎНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

Рабкоры—камуністы Пралетарска-Слабодзкага раёну правялі шырокую праверку падрыхтоўкі да чысткі раённай арганізацыі КП(б)Б.—Ініцыятыва рабкораў поўнасьцю сабе апраўдала. Праверка выявіла сапраўднае становішча падрыхтоўкі работы.—Прыклад рабкораў Пралетарска-Слабодзкага раёну павінны пасьледаваць іншыя арганізацыі

Апошні пленум раённага камітэту партыі **Пралетарска-Слабодзкай** арганізацыі (**Віцебшчына**) ухваліў пастанову аб датэрміновай чыстцы раённай арганізацыі КП(б)Б. Гэта пастанова выклікана тым, што сярод часткі членаў арганізацыі і ў практыцы асобных партыйных ячэек былі дапушчаны права-апартуністычныя памылкі і скажэньні лініі партыі.

Некаторыя бюро ячэек і частка камуністых замест рашучага рэагаваньня на ўсе памылкі і скажэньні, імкнуліся замазаць гэтыя прарывы, прыніжаць іх значэньне і патрэбнасьць барацьбы з імі.

Для таго, каб яшчэ больш забясьпечыць правільнае правядзеньне лініі партыі на ўсіх вучастках і ва ўсіх зьвяньнях работы раённай арганізацыі, раённы камітэт і ўхваліў пастанову аб датэрміновай чыстцы, каб, аньсьцёўшы арганізацыю ад чужакоў і пэрадольных быць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва,—прыступіць да рашучага ўзмацненьня і нерабудаваньня партыйна-палітычнай работы ў раёне.

У сувязі з гэтай пастановай рабкоры з раённых фабрык і заводаў прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўчай рабоце да чысткі арганізацыі, праводзячы шырокую праверку падрыхтоўчай работы на ўсіх партыйных ячэйках і вытворчых партклектывах.

Ініцыятыўная група рабкораў-камуністых **фанэрнага і лесапільнага** заводаў і фабрыкі **«Дзьвіна»** нядаўна правяла шырокую масавую праверку, як раённы камітэт партыі і ячэйкі раёну рыхтуюцца да праверкі і чысткі арганізацыі.

Праверка паказала, што раённы камітэт партыі правёў вялікую работу па падрыхтоўцы арганізацыі да чысткі. Наўкола задач чысткі створана грамадзкая думка. Па пытаньні аб датэрміновай чыстцы адбыўся пленум раённага камітэту партыі і выпушчана адозва да ўсіх рабочых, с.-г. рабочых і батракоў раёну а заклікам прыняць самы актыўны ўдзел у праверцы і чыстцы раённай арганізацыі. З боку раённага камітэту былі сваячасова даны адпаведныя дырэктывы ячэйкам па самаправерцы работы, правядзеньні гутарак па цэхах заводу і фабрык аб палітычных задачах і асноўных прынцыпах чысткі і г д.

Рабкоры абсьледавалі ячэйкі КП(б)Б фанэрнага і лесапільнага заводаў і партыйную ячэйку фабрыкі «Дзьвіна», дасканала праверыўшы работу па падрыхтоўцы да чысткі, праведзеную ў гэтых ячэйках. Рабкоры высьветлілі, што партыйныя ячэйкі гэтых прадпрыемстваў у асноўным добра падрыхтаваліся да чысткі. Па цэхах, аддзяленьнях і зьменах праведзены агітацыйна-растлумачальныя гутаркі. Пытаньне аб чыстцы стала на рабочых сходах, сходах делегатак і г. д. Паралёўна слаба праведзена агітацыйна-растлумачальная работа на фабрыцы «Дзьвіна». Тут было вельмі мала праведзена гутарак аб чыстцы партыі сярод беспартыйных рабочых, што нават пры агульнай здавальняючай падрыхтоўцы зьяўляецца вялікім недахопам.

Пры дапамозе рабкораў выяўлены буйныя недахопы ў работы партыйна-абсьледаўчых брыгад. Выяўленыя брыгады працуюць толькі на асобных прадпрыемствах. На лесазаводзе і фабрыцы «Дзьвіна» партыйна-абсьледаўчыя брыгады бязьдзейнічаюць. На гэты вучастак падрыхтоўкі трэба сваячасова зьвярнуць максымум увагі і безадкладна выправіць усе памылкі і недахопы.

Заводзкія друкаваныя і насьценныя газэты яшчэ не зьвярнулі належнай увагі на падрыхтоўку да чысткі райпартарганізацыі.

Трэба адзначыць, што падрыхтоўка да чысткі ў партыйных ячэйках лесазаводу, фабрыкі «Дзьвіна» і фанэрнага заводу цесна ўвязана з задачамі вярбоўкі ў рады партыі новых пралетарскіх кадраў. У выніку лепшыя рабочыя і работніцы падаюць заявы аб уступленьні ў партыю. На фабрыцы «Дзьвіна» падалі заявы аб прыняцьці ў партыю 45 рабочых і работніц, з якіх 14 зьяўляюцца делегаткамі. На лесазаводзе падана 14 заяў ад рабочых аб прыёме ў рады партыі, на фанэрным заводзе гэтых выпікі трэба замацаваць і падалей яшчэ больш узмацніць вярбоўку ў рады партыі.

Наогул ініцыятыва пралетарска-слабодзкіх рабкораў поўнасьцю сябе апраўдала. Рабкоры-праверка дапамагла арганізацыі значна паляпшыць і ўзмацніць падрыхтоўку да чысткі сваіх радоў.

Н. ДВАРСОН.

Да дзесяцігодзьдзя саюзу працмастацтва

ЗА ВЫРАЗНУЮ ПРАЛЕТАРСКУЮ ЛІНІЮ У МАСТАЦТВЕ

Супроць апалітычнасьці, „чыстага" культурніцтва

На барацьбу з праявамі буржуазнай ідэалёгіі ў мастацтве

Мастацтва--на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

Дзесяцігодзьдзе саюзу працмастацтва зьбліжаецца пераломным момантам ня толькі ў жыцьці самога саюзу, але яно павінна прайсьці пад знакам усебаковай ацэнкі яго працы ўсёй савецкай грамадзкасьцю.

Задачы сацыялістычнай рэканструкцыі і мабілізацыі актыўнасьці пралетарскіх мас прадявілі саюзу цьвёрдае запатрабаваньне вызначыць месца, якое займае мастацтва ў працэсе культурнага будаўніцтва. У перыяд абвостранай клясавай барацьбы, якая вядзецца і на ідэалёгічным фронце, саюз працаўнікоў мастацтва павінен даць ясны адказ, якую пазыцыю ён займае ў гэтай барацьбе, ці магчыма далей заставацца апалітычным і нэйтральным наглядальнікам гэтай барацьбы. Саюз працаўнікоў мастацтва павінен мець выразную ідэалёгічную лінію і мабілізаваць усю масу сваіх членаў для барацьбы з супраціўленьнем клясавага ворага.

Рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі і культуры вымагае і рэканструкцыі ўсіх відаў мастацтва, вымагае набліжэньне мастацтва да рабочых, батрацкіх і бяднякка-серадняцкіх мас, расшчырае перагляду рэпэртуару, які ёсьць, у бок папулярызацыі галоўных задач камуністычнае партыі і савецкай улады (індустрыялізацыя краіны, калектывізацыя вёскі, узьняцьце вытворчасьці, сацспаборніцтва і г. д.), правільнага правядзеньня нацыянальнай палітыкі праз ўсе віды мастацтва («мастацтва пралетарскае па зьмесьце, нацыянальнае па форме»). Пяцігодка па разьвіцьці мастацтва павінна быць цалкам і поўнасьцю прыстасавана да служэбы пралетарыяту і бядняцка-серадняцкіх мас.

Перад саюзам працаўнікоў мастацтва ў сучасны момант стаіць цэлы рад вытворчых задач: зьніжэньне сабекошту, павышэньне працдысцыпліны, узьняцьце прадукцыйнасьці, барацьба за эканомію і выдаткаваньне матар'яльных сродкаў і ўдзел, разам з усім пралетарыятам, у сацыялістычным спаборніцтве.

Ці падрыхтаваная саюзная маса сёньня да выкананьня ўсіх гэтых задач?

На сёньня яшчэ не падрыхтавана. Таму перавыхаваньне старых кадраў і падрыхтоўка новых у залежнасьці ад патрабаваньняў сацыялістычнай рэканструкцыі мастацтва зьяўляецца цэнтральнай задачай саюзу.

Мы павінны сказаць: нам ня трэба мастацтва апалітычнага. Нам трэба мастацтва, якое агітуе, мастацтва, якое будуе, мастацтва, якое вядзе барацьбу за выразную пралетарскую лінію. У гэты бок тэатры павінны перагледзець свой рэпэртуар на працягу бліжэйшага тэрміну, мастакі—тэмы сваіх карцін, кіно—зьмест сваіх фільмаў.

Ні аднаго кроку ўступкі апалітычнаму «мастацтву для мастацтва».

Усе сілы мастацтва на справу сацыялістычнага будаўніцтва і спаборніцтва.

Л. Папова.

Задачы мастацтва і культуры

Роля і значэньне ўсіх галін мастацтва (тэатр, кіно, музыка, выяўленчае мастацтва) вельмі вялікае. Мастацтва спэцыфічна ўласьцівымі яму сродкамі арганізуе ў пэўным кірунку пачуцьці чалавека, ўплывае на яго псыхіку, яскравым

Падрыхтоўку да сяўбы пераключым на высокія тэмпы

Мабілізуем вясковы актыў, камсамол і калгасьнікаў

Не прапусьцім дарэмна ніводнага дня

Ва ўчарашнім нумары нашай газэты мы зьмясьцілі пастанову СНК БССР аб с.-г. кампаніі ў БССР у 1929-30 годзе. Гэта пастанова, якая ахапляе як веснавую, так і асеньнюю с.-г. кампаніі, прадстаўляе сабою вялізарнейшы інтарэс і павінна прыцягваць да сябе максымальную ўвагу савецкай грамадзкасьці як у горадзе, так і ў вёсцы.

Нам на працягу 2-3 год трэба будзе калектывізаваць усю беларускую сельскую гаспадарку. Выходячы з гэтае задачы, СНК вызначае вельмі высокія заданьні па калектывізацыі, па якіх мы ў новы гаспадарчы год павінны будзем увайсьці з 40 проц. калектывізаванай пасеўнай плошчай. Пры такім тэмпе калектывізацыі, калі будуць зьнішчаны межы і палявыя шляхі, мы зможам значна пашырыць пасеўную плошчу.

Адначасова з мерапрыемствамі па калектывізацыі нам трэба будзе правесьці шырокія мерапрыемствы па ўзьняцьці прадукцыйнасьці і па рэканструкцыі ўсёй сельскай гаспадаркі. Перад нашай сельскай гаспадаркай (як у аграмаджаным, так і ў індывідуальным сэктары) стаіць задача — зчысьціць на 100 проц. увесь пасеўны матар'ял. І тут прыдзецца ўважліва прасачыць за тым, каб ачыстка збожжа пачалася свачасова і каб машыны па ачыстцы збожжа працавалі з поўнай нагрузкай.

Па жывёлагадоўлі перад намі стаіць надзвычайна напружанае заданьне — павялічыць стада буйной рагатай жывёлы на 10 проц. і сьвіней — на 30 процантаў.

У справе забесьпячэньня сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці найвялікшыя труднасьці будуць з атрыманьнем канюшыны, мінэральных угнаеньняў і складаных машын, у прыватнасьці трактараў. У адносінах трактараў «Зьвязда» ўжо ўзьняла пытаньне аб дадатковым зборы другарадных экспартных тавараў у мэтах дадатковага атрыманьня трактараў. Гэтую справу, прымаючы пад увагу вострую патрэбу Беларусі ў вялікай колькасьці трактараў, трэба будзе абавязкова ажыцьцёвіць.

Вельмі востра стаіць пытаньне з забесьпячэньнем патрэб нашай сельскай гаспадаркі — калгасаў, мэліяраваных плошчаў, кантрактантаў — мінэральным угнаеньнем. Масква нам адпускае такую колькасьць мінэральных угнаеньняў, якая не задаволіць усіх нашых патрэб. Пры гэтым саюзны Наркамгандаль зусім няправільна разьлічыў водпуск нам гэтага ўгнаеньня — 25 проц. да веснавой пасеўнай кампаніі і 75 процантаў да асеньняй. Для Беларусі, пры яе жывёлагадоўчым ухіле з пераважнай тэхнічных культур, такое разьмеркаваньне зусім не падыходзіць. Саюзны Дзяржплян ўжо стаў на наш пункт погляду — і трэба меркаваць, што гэтае разьмеркаваньне будзе зьменена.

Але гэтага яшчэ мала — нам трэба прылажыць усе намаганьні на максымальнае скарыстаньне мясцовых магчымасьцяй. Нашы прадпрыемствы, якія вырабляюць фасфарыт і муку, павінны пачаць працу з узмоцненым тэмпам. Далей трэба мабілізаваць усе сілы для збору і скарыстаньня попелу, які замяняе калійнае ўгнаеньне, і трэба шырока паставіць тарфаваньне і вапнаваньне глебы.

Нашу ўвагу павінны прыцягнуць майстэрні па рамонце с.-г. машын, трэба павялічыць сетку рамонтных майстарань, трэба свачасова паклапаціцца аб забесьпячэньні іх жалезам і сталлю.

Нам няма дзе рамантаваць складаныя машыны і трактары, неташыня дырэктыва аб абсталяваньні такіх майстэрань яшчэ дагэтуль ня выканана — гэтага нельга забываць.

Перад намі ў г. г. стаіць яшчэ праблема забесьпячэньня рабочай сілай буйных калгасаў і арганізацыя працы ў іх. Гэта праблема ўскладняецца яшчэ тым, што тут няма практыкі, няма і літаратуры. Каб такую літаратуру стварыць, каб набыць практыку ўлічыць, трэба вывучаць справу арганізацыі працы ў калгасах, падсумоўваючы і падагульваючы гэтыя даныя. Наркамзем і Белкалгассаюз з гэтай справай ня справяцца — нам трэба стварыць нейкі інстытут, нейкую ячэйку па вывучэньні гэтага пытаньня.

На нашым шляху па калектывізацыі і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі мы бязумоўна будзем сустракацца з супраціўленьнем кулакоў, якія будуць збываць на прыватны рынак сваю жывёлу і якія будуць дэманстраваць недасеў сваіх зямельных плошчаў. Мы прымусім кулакоў выканаць усе нашы дырэктывы і мерапрыемствы, у прыватнасьці поўнасьцю засеяць свае зямельныя вучасткі і інш., інакш прыдзецца за бязгаспадарчасьць забраць у кулакоў іх зямельныя плошчы і перадаць іх грамадзтву.

У пастанове СНК адсутнічаюць два моманты — кадры і кантрактацыя. Пытаньне аб кадрах для сельскай гаспадаркі зараз распрацоўваецца Дзяржпляном. Што датычыць кантрактацыі, то тут высоўваецца праект кантрактацыі іравых пасеваў на ўсе 100 проц. Пытаньне гэта ў бліжэйшыя дні будзе разглядацца на спэцыяльнай нарадзе ў Маскве — і пасьля гэтага СНК БССР вынясе пастанову.

Надзвычайныя тэмпы надыходзячай с.-г. кампаніі выклікаюць патрэбнасьць у іншых, больш інтэнсыўных, больш шпаркіх мэтадах работы. Гэта адносіцца да ўсіх наркаматаў і да ўсіх установаў, так ці інакш зьвязаных з сельскай гаспадаркай і калектывізацыяй.

Да сельска-гаспадарчай кампаніі гэтага году СНК паставіў вельмі высокія ліміты, і мы зможам іх выканаць толькі тады, калі мы паўкола ўсіх пытаньняў с.-г. кампаніі арганізуем грамадзкую думку рабочае клясы, калгасьнікаў і бядняцка-сярэдняцкіх сялянскіх мас. Пасеўныя пляны, свачасова распрацаваныя, нам трэба давесьці да кожнага асобнага саўгасу, калгасу і сельсавету, нават да асобнага сялянскага двара. Але трэба, каб гэтыя пляны складаліся сьцісла, ясна і выразна, каб яны былі зразумелы на нізох, каб у іх было лёгка разабрацца.

Л. НЯФЕДАЎ.

Вясной калгасамі БССР будзе ахоплена 2.169.000 гэктараў

Якія задачы стаяць наперад веснавой пасеўнай кампаніяй у калгасах.

Першая задача — **далейшая арганізацыя новых калгасаў, узмацненьне і ўзбудненьне існуючых калектыўных гаспадарак.**

Другая задача — **правядзеньне суцэльнай калектывізацыі вызначаных раёнаў і арганізацыя ў іх плянавага засеву яравога кліну.**

Трэцяя — **мерапрыемствы па павышэньні ўраджайнасьці на 25 проц. у параўнаньні з 1928 годам.**

Чацьвертая — **пашырэньне пасеўнай плошчы ня менш, чым на 6 проц. як за лік уключэньня ў с.-г. зварот новых зямель, так і за лік скарачэньня плошчы незанятага папару і г. д.**

Нарэшце, калгасы павінны пашырыць засевы тэхнічных культур: ільну і канапель, траў і кораньплодаў.

Плян Белкалгассаюзу прадугледжвае калектывізацыю ў веснавую пасеўную кампанію ня менш 25 проц. пасеўнай плошчы БССР супроць 4 проц. на 1-е кастрычніка 1929 году. Да восені 1930 г. калектывізацыя ахопіць ня менш 40 проц. усёй пасеўнай плошчы рэспублікі.

Такім чынам, вясною калгасамі будзе ахоплена 2.169.000 гэкт., а ўвосень — 3.509 тыс. гэкт.

Сёлета завозу насеньня з-за межаў БССР амаль ня будзе. Калгасы будуць забясьпечвацца толькі за лік мясцовых загатовак насеньня.

Асабліва востра стаіць пытаньне з лубінам і канюшынай. Канюшына часткова будзе завезена, а лубін павінен загатаўляцца ў межах Беларусі.

Каля 3 проц. пасеўнай плошчы праектуецца засеяць лубінам на ўтнаеньне і 2 з палов. проц. лубінам на насеньне.

У 1930 годзе ўпяршыню ў БССР будзе засявацца кукуруза і сланечнік на сілос. Пад засеў адводзіцца 5.200 гэкт., што складае каля 0,5 проц. пасеўнай плошчы. У кожным калгасе праектуецца абсталяваньне сілоснай установкі.

Значна горш абстаіць справа з угнаеньнямі. Калгасам Беларусі патрэбна 178 тыс. тон усіх відаў угнаеньняў на суму 6.500 тыс. руб., адпускаецца-ж толькі 15 тыс. тон.

Як абстаіць справа з машынамі? Белкалгассаюз даў заяўку на трактары і машыны на суму каля 3 млн. руб. Гэта заяўка будзе задаволена. Калгасы атрымаюць 192 трактары. Белкалгассаюз намеціў арганізаваць па округах 56 майстэрань па рамонце с.-г. машын і трактараў.

Калгасаюз даў месцам дырэктыву аб давядзеньні плянаў веснавой кампаніі непасрэдна да кожнага калгасу, каб кожны калгас ведаў усе мерапрыемствы, якія датычаць яго.

М. К.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА.

У аўторак. 17-га сьнежня, а 7-й г. увеч. у Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68)

ПАЎЛЮК ШУКАЙЛА зачытае свае новыя творы:

1) Партызанка Люба (паэма). 2) Акорды даён (паэма).

Перад тым, як зачытаць іх, аўтар зробіць уступныя словы пра стыль сучаснай паэзіі.

Пасьля зачытаньня абгаворваньне і крытыка гэтых твораў. Запрашаюцца пісьменьнікі, крытыкі, настаўнікі, студэнты і рабкоры.

УВАХОД ВОЛЬНЫ.

Прызыдыум савету і праўленьне Бел. Цэнтр. садова-гароднага калгассаюзу склікаюць

II СЭСІЮ САВЕТУ

на 19-е сьнежня г. г. а 10 гадз. раніцы ў памяшканьні быўш. Белсельсаюзу (Менск, Савецкая, 46).

Просьба да ўсіх членаў савету, рэвізыйнай камісіі, а таксама запрошаных на сэсію таварышоў зьявіцца без спазьненьня.

Прэзыдыум Савету і праўленьне Бел. Цэнтр. садова-гароднага Калгассаюзу.

ЗВЕЗДА

Па Савецкай Беларусі

Медзь звоніць у калёл індустрыялізацыі

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Агульны сход курсантаў Віцебскіх беларускіх аднагадовых і двухгадовых курсаў у колькасьці 250 чалавек вынес пастанову — зьняць з цэркваў гораду званы, якія толькі перашкаджаюць у часе работы і вучэньня. Званы дадуць вялікую нарыюць індустрыялізацыі краіны, якая мае патрэбу ў мэталі.

Адкрываюцца акруговыя курсы вылучэнцаў

ВОРША. (Наш кар.). З 1-га студзеня адкрываюцца акруговыя курсы па падрыхтоўцы вылучэнцаў на кіруючыя пасады ў выканкомах, каапэрацыі і прамысловасьці. Курсы разьлічаны на 70 чал. 60 проц. курсантаў — рабочыя, 15 проц. — батракі, 15 проц. — калгасьнікі.

ВЫЛУЧЭНЬНЕ РАБОЧЫХ У САВЕЦКІ АПАРАТ

ВОРША (наш кар.). Прэзыдыум АВК вызначыў у акруговых установах 22 пасады, якія павінны быць замешчаны вылучэнцамі з рабочых, калгасьнікаў і батракоў.

Вылучэнцы будуць прызначаны на ад казныя пасады ў акрпракуратуры, фінаддзеле, інспэктарыяце лясоў і г. д.

МЯСЦОВУЮ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ — НА БЕСЬПЕРАПЫНКУ

ВОРША (наш кар.). Пакуль з гарадзкіх прадпрыемстваў на бесьперапынку перайшлі толькі электрастанцыя, аўтакіраўніцтва і механічная майстэрня. Пяройдуць на бесьперапынны рабочы тыдзень аршанскі млын і цагельня. Для пераводу ўсіх гэтых устаноў на бесьперапынку патрэбны дадатковыя сродкі ў суме 15.500 руб., водпуск якіх прадугледжаны прамфінпляном на 1929-30 год.

Віцебскія судзьдзі—на абароне гандляроў і пазбаўленых

Тэорыя судзьдзі Сухандравай аб „мяккіх адносінах да гандляроў мяжы аселасьці"

Гэтымі днямі скончылася рэвізія аб'яднанага вучастку народнага суду гор. Віцебску. **У судзе знойдзена неразгледжаных на 1-га кастрычніка каля 3.000 спраў.** Судзьдзі гэтага вучастку на працягу двух год у сваіх прыгаворах і пастановах дапускалі **ўпяр скажэньне клясавай лініі;** пры разглядзе кватэрных, падатковых і інш. спраў віцебскія судзьдзі бралі пад сваю абарону гандляроў, наймана, пазбаўленых выбарчых праў і давалі ім усялякія паблажкі.

Так, напрыклад, гандляр Залман-Шолам за нявыплату каля 3.000 руб. падатку быў аштрафаваны толькі на... 10 рублёў. Гандляр Мэерзон, які не заплаціў 1.184 р. падатку, таксама быў аштрафаваны суком толькі на 50 руб.

Буйныя гандляры за тое, што яны не вялі грашовых кніг, штрафаваліся віцебскімі судзьдзямі толькі ад 5 да 50 руб., прычым гэта сума па просьбе гандляроў раскладалася для ўзносу на некалькі тэрмінаў.

Характэрна, што пасобныя справы, па якіх судом скажалася клясавая лінія, нападалі ў акрсуд, але апошні не выпраўляў гэтых памылак і такія справы зацьвярджаў. Вось прыклады: чатыры гандляры — Зомфарт і інш. — за нявыплату больш 23.000 руб. падатку, былі прыгавораны нарсудом Лёзьнянскага раёну ад 6 да 8 месяцаў зьняволеньня; акруговы суд пакінуў пратэст пракуратуры на гэты прыгавор бяз вынікаў.

Зусім іншую лінію вялі віцебскія судзьдзі пры разглядзе спраў працоўнага насельніцтва. Быў выпадак, калі інваліда за нявыплату 24 руб. па пастанове суду высялілі з кватэры. Па другой справе адказчык - працоўны быў выселены з прыватнага дому за тое, што не заплаціў 7 руб. кватэрнае платы.

Пры вынясеньні пастаноў аб непрацоўным элемэнце суд звычайна даваў такую фармулёўку, што «адказчык у цяперашні час беспрацоўны», што «яго матар'яльнае становішча вельмі цяжкое» і г. д. Суд не высяляе гандляроў і таму, што «гэта можа пашкодзіць як яго здароўю, так і сям'і», што «перадача кватэры гандляра працоўнаму нямэтазгодна» і што «жакт не даказаў, ці прыгодна кватэра, якую займае непрацоўны, для рабочых». Усе гэтыя пастановы суду зьяўляюцца клясычнымі прыкладамі правай практыкі.

Паўтараем, што віцебскі акрсуд не выпраўляў памылак, якія рабіў народны суд.

Паўстае запытаньне, як гэта здаралася такія грубыя палітычныя памылкі і з боку нарсуду, і акрсуду! Адказ на гэтае пытаньне дае сход ячэйкі судовых устаноў г. Віцебску, дзе быў заслуханы акт рэвізіі аб'яднанага суду. Віцебскі аб'яднаны народны суд меў у сваім складзе за судзьдзю тав. Сухандраву. Сухандрава, якая да рэчы зьяўлялася членам бюро ячэйкі і старшынёй місцкому, у сваёй рабоце кіравалася такой тэорыяй: «ўпрэ доўгі час жылі ў мяжы аселасьці, некаторыя з іх прымушаны былі займацца гандлем. Вось таму цяпер да гандляроў - ўправу суд і павінен прыстасоўваць мяккую меру сацыяльнай абароны». Ясна, што такія погляды Сухандравай адбіваліся і на ўсёй рабоце суду.

Акрсуд работай аб'яднанага суду на цікавіўся. Ён на працягу двух год не зрабіў ні аднэй рэвізіі, ні склікаў ні аднэй нарады гарадзкіх судзьдзяў. Ніхто на сходах дзейнасьці суду не крытыкаваў, за выключэньнем паасобных таварышоў, якія закранялі гэтае пытаньне вельмі і вельмі асьцярожна. Ніхто не паставіў ва ўсю шырыню пытаньня — ці спраўляецца акрсуд з тымі задачамі, якія стаяць перад ім у момант абвостранай клясавай барацьбы. Нікому на прышло ў галаву, як сьлед, узяць пад абстрэл кіраўніцтва партыйнай ячэйкі. Самакрытыка як сярод партыйцаў, так і беспартыйных судовых работнікаў разгорнута слаба.

Вось усе гэтыя адмоўныя моманты і зьяўляліся вынікам таго, што віцебскія судзьдзі нарабілі шмат грубых, палітычных памылак у сваёй практычнай рабоце.

А. Ю.

Бюракратычная перапіска

ЗАМЕСТ ЖЫВОЕ СПРАВЫ

БЕЛКААПСАЮЗ, БЕЛМЯСГАНДАЛЬ І БЕЛСЕЛЬТРЭСТ ВЕЛЬМІ МАЛА ЗРАБІЛІ ДЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ГАРАДОЎ МЯСАМ

Пытаньне навялічэньня рэзэрваў мяса і эканомнае выдаткаваньне, яго зьяўляецца ў сучасны момант адной з галоўнейшых задач работы нашых ганлёвых і каапэрацыйных арганізацый. Сучасныя тэмпы работы ў гэтай галіне зусім не забясьпечваюць выкананьне дырэктыў партыі.

Асобныя арганізацыі замест таго, каб прыступіць да выкананьня даных ім дырэктыў, займаюцца бюракратычнай перапіскай і адпіскай. Так, напрыклад, Белкаапсаюз і Белмясгандаль у адказ на разьмеркаваньне заданьня па загатоўцы сьвіней для адкорму знайшлі неабходным яшчэ да прыступленьня да загатовак, напісаць усім, што заданьне яны ня змогуць выканаць.

Белсельтрэст, бачачы, што Белмясгандаль і Белкаапсаюз адмаўляюцца ад загатоўкі сьвіней, лічыць таксама, што гэтым з яго адказнасьць зьнята.

Замест таго, каб падшукаць для адкорму жывёлы гатовыя памяшканьні, якія могуць быць скарыстаны пры мінімальным рамонце, Белкаапсаюз патрабуе адпусьціць грошы і матар'ялы для будаўніцтва новых адкормачных пунктаў.

Акрганделі і мясцовыя органы да гэтага часу яшчэ не завастрылі пытаньня аб эканомным выдаткаваньні мяса.

Пастаўленыя перад загатоўчымі арганізацыямі задачы патрабуюць максымальнай увагі ўсяго апарату. Месцы павінны ўсьвядоміць сабе неабходнасьць выканаць да 1-га сакавіка 70 проц. гадавога пляну загатовак мяса. На сёнешні дзень плян мясазагатовак выкананы ў разьмеры 23 проц.

Да 1-га лютага павінна быць пастаўлена на адкорм 25.000 сьвіней у адну засадку, з якіх ня менш 50 проц.—да 1-га студзеня. Між тым гэтае заданьне пакуль выканана толькі ў разьмеры 15 проц.

Цэнтральныя акруговыя арганізацыі павінны вылучыць спэцыяльных працаўнікоў, занятых справай адкорму. Трэба яшчэ раз праверыць працаздольнасьць загатоўчага апарату і адведпа яго ўзмоцніць.

Рашуча павінна быць узмоцнена барацьба з прыватнікам на мясным рынку. Месцы павінны забясьпечыць поўную ліквідацыю прыватнага гандлю мясам, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з нетайным убоем жывёлы як у гарадох, так і ў вёсцы.

Месцы павінны завастрыць пытаньне аб эканомным выдаткаваньні мяса як у гарадох, так і ў вёсцы.

Акрганделі павінны сыстэматычна правяраць выкананьне на мясцох дырэктыў Наркамгандлю па загатоўках, адкорме, засолцы і эканомным выдаткаваньні мяса. Усе вінаватыя ў парушэньні і невыкананьні дырэктыў павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці.

Да праверкі ходу загатовак мяса і адкорму павінны быць прыцягнуты шырокія колы рабочых і вясковы актыў.

Уся грамадзкасьць павінна прыйсьці на дапамогу загатоўчым арганізацыям і дабіцца выкананьня важнейшай дырэктывы аб забесьпячэньні мясам гарадоў і вёсак.

„Пастэрызаванае" малако для Менску

Гэтымі днямі ў газэце «Рабочий» паведамлялася, што ЦРК будзе адпускаць пастэрызаванае малако.

І вось спажывец дачакаўся «пастэрызаванага» малака... Спачатку ён здзівіўся, а потым абурыўся.

Спажывец патрабуе кампэтэнтнага абсьледваньня з удзелам рабочых гэтай «пастэрызацыі», бо, наколькі нам вядома, сапраўдная пастэрызацыя зьнішчае толькі адных мікробаў, **але тлушч пакідае някранутым.** Далей: пастэрызаванае малако абавязкова закаркоўваецца, ў бутэлькі, а не заходзіцца ў звычайных бляшаных 100-літравых бітонах, як гэта робіцца ў нас.

Зараз дзецца проста абыстлушчанае малако.

СПАЖЫВЕЦ.

Кампдагаворная кампанія

У некаторых мясцох змазваецца палітычная сутнасьць кампаніі

На Аршанскім чыгуначным вузьле растлумачальная работа была праведзена слаба. На Бабруйскай хлебапякарні ЦРК і ст. Бярэзіна распушчаны мясцкомы, якія праводзілі кампанію бяз удзелу мас. Рабочыя Менскай шчацінчай фабрыкі дапамаглі бабруйскім шчаціншчыкам выправіць свае палітычныя памылкі.

Бабруйскія шчаціншчыкі выпраўляюць свае памылкі

Яны абяцаюць выканаць экспартны плян

У «Зьвязьдзе» ў свой час паведамлялася аб тым, што бабруйскія шчаціншчыкі пры перазаключэньні новага калдагавору высунулі рад рвацкіх патрабаваньняў, якія ішлі ў разрэз з агульнымі інтарэсамі рабочае клясы.

Менскія шчаціншчыкі, даведаўшыся аб патрабаваньнях бабруйскіх шчаціншчыкаў, былі вельмі абураны гэтым зьявішчам. На сваім сходзе яны пастанавілі паслаць у Бабруйск свайго прадстаўніка т. Рохкіна, каб ён растлумачыў памылкі бабруйскіх шчаціншчыкаў. На сходзе Бабруйскай шчаціннай ф-кі рабочыя прызналі свае памылкі, якія заключаліся ў тым, што імі ня было ўсьвядомлена значэньне новага калдагавору, як двухбаковага абавязацельства, які павінен забясьпечыць выкананьне пяцігадовага пляну ў 4 гады.

Бабруйскія шчаціншчыкі прызналі, што сваімі непрадуманымі патрабаваньнямі яны маглі затрымаць тэмп выкананьня пяцігодкі. Вось што яны пішуць у сваёй пастанове:

«Другі год пяцігодкі патрабуе ад нас напружанасьці і перамогі ўсялякіх труднасьцяй, а таксама патрабуе рашучай барацьбы з усялякімі рвацкімі пагрозамі, якія на справе ідуць на руку клясаваму ворагу. А таму мы катэгарычна асуджаем нашу папярэднюю пастанову па гэтым пытаньні, якая ідзе ў разрэз з дырэктывамі партыі, савецкай улады і прафарганізацыі.

Рабочыя катэгарычна адмяжоўваюцца і адмаўляюцца ад патрабаваньня павышэньня наміналу, прымаючы пад увагу, што ўзровень зарплаты рабочых шчаціншчыкаў перавышае сярэдні заработак рабочых іншых галін прамысловасьці, і лічаць павялічэньне наміналу ў даных умовах яўна рвацкім патрабаваньнем.

Па пытаньні падняцьця прадукцыйнасьці працы ў алкаведнасьці з прамфінплянам рабочыя заяўляюць, што імі будуць прыняты ўсе меры па перавыкананьні прамфінпляну.

Індустрыялізацыя нашай краіны і рэканструкцыя сельскай гаспадаркі на аснове калектывізацыі патрабуюць узмоцненага экспарту і, мы рабочыя-шчаціншчыкі, працуем выключна для экспарту, прыложым усе сілы, каб выканаць экспартны плян.

У адпаведнасьці з выкананьнем дырэктыў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) і верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)В аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пасылаем рабочага-перадавіка для ўдзелу ў арганізацыі калгасу ў нашай падпэфнай вёсцы і яшчэ аднаго рабочага на сталую працу ў вёску на менш, як на 1 год у калгас».

Бяз удзелу мас

Кампанія па заключэньні новых калектыўных дагавораў на Аршанскім чыгуначным вузьле пачалася яшчэ 5-га лістапада. Аднак, кампанія праходзіць незадавальняюча. Галоўны недахоп у тым, што маса рабочых чыгуначнікаў ня была ўцягнута ў праверку выкананьня старога калдагавору. Усяго на вузьле ў праверку калдагавору вылучана 16 брыгад, у склад якіх уваходзіць 84 чал. Дрэнна яшчэ і тое, што **рабочыя брыгады складаліся ня з добраахвотнікаў,** а выбіраліся на цэхавых сходах, бо жадаючых працаваць добраахвотна ў брыгадах не знайшлося. Яшчэ лепш сьведчыць аб слабым праводзеньні кампаніі дрэнная падрыхтоўчая работа. **Дрэнна была разгорнута растлумачальная работа сярод прафсаюзнай масы аб палітычнай важнасьці калдагаворнай кампаніі. Задачы, якія ставяцца пяцігодкай,** пераход на бесьперапынку рабочым амаль не растлумачаны. Слаба завострана ўвага на пытаньні барацьбы з рвацкімі тэндэнцыямі. На вузьле з 5-га лістапада да гэтага часу праведзены ўсяго 2 цэхавыя сходы. На адным з гэтых сходаў на службе пуці было 488 чалавек з агульнай колькасьці рабочых і служачых цэху 589 чал. Аднак, і гэты шырокі сход кіруючыя арганізацыі ня здолелі выкарыстаць для належнай растлумачальнай работы, для завастрэньня ўвагі рабочых на гэтай важнай палітычна-гаспадарчай кампаніі. У спрэчках на дакладах гаспадарнікаў і інш. выступалі чатыры таварышы Прамоўцы больш за ўсё спыняліся на нявылачы спэцвопратак, зьвышнормавых работах, дрэнной тэхніцы забясьпекі і г. д. Спрэчкі разгортваліся вакол розных дробных пытаньняў, бо ні парт'ячэйка ні фабзайком ня здолелі добра кіраваць калдагаворнай кампаніяй.

Спэцыяльных дакладаў аб задачах калдагаворнай кампаніі нідзе не праводзілася, і дырэктыўныя лісты УсеЦСПС і ЦСПСБ таксама не абмяркоўваліся.

У часе абмеркаваньня выкананьня калдагавору выявілася, што дзяжурныя памяшканьні паравозных брыгад трымаюцца ў антысанітарным стане вішчы. Вэнтыляцыя ў дэпо — дрэнная у памяшканьні дэпо поўна дыму, што не дае магчымасьці нармальна працаваць. У пакгаўзах зьвышнормава рабочыя працуюць па 14 гадзін, а ў канторах гэта — звычайнае зьявішча. Досыць часта парушаўся і парадак адпускоў іх адміністрацыя замяняла грашовай кампэнсацыяй. Адміністрацыя навазрывала звычайныя дні адпачынку. Ёсьць шмат фактаў, калі адміністрацыя прымала новых рабочых і служачых бяз ведама саюзу або біржы працы. У гэтай прычыны на работу пападалі часта кулакі, царкоўнікі, паліцэйскія, гандляры і г. д.

Ёсьць ня мала выпадкаў, калі на працягу ўсяго году працуюць сэзонныя і часовыя рабочыя, чаго паводле калдагавору не павінна быць. Ня выконвае адміністрацыя і правільнасьці тарыфікацыі аплаты рабочых, асабліва гэта датычыць жанчын, якія былі на аднолькавай працы з мужчынамі, а плат атрымлівалі на 1-2 разрады ніжэй.

І вось, ня гледзячы на рад такіх важных фактаў і недахопаў у справе выкананьня старога калдагавору, кіруючыя арганізацыі ня здолелі завастрыць увагі рабочых на калдагаворнай кампаніі і зрабіць яе, як гэта належала, гаспадарча-палітычнай кампаніяй.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

Распушчаны два мясцкомы

Мясцком хлебапякарні ЦРК у Бабруйску і МК ст. Бярэзіна, мабыць, зусім ня чыталі пастаноў вышэйшых органаў. Таму ня прыходзіцца дзівіцца, што калдагаворная кампанія праводзілася бюракратычна. МК хлебапякарні пачаў праверку калдагавору і не правёў да канца. МК ст. Бярэзіна, абгаварыўшы праект новага дагавору на пасяджэньні прафактыву, аладаў яго ў Учкпрафсож. Такім чынам, маса засталася ў баку, перад ёю ня былі пастаўлены палітычныя задачы новага калдагавору, як двухбаковага абавязацельства.

Бабруйскае акрпрафбюро правільна зрабіла, калі распусьціла аболвы мясцкомы, як нездольныя праводзіць у жыцьцё дырэктывы вышэйшых органаў.

Дагавор заключаны

(Галянтарэйная ф-ка «Беларуска», Менск)

Калектыўны дагавор спачатку абгаворваўся на цэхавых сходах, а пасьля на агульным сходзе рабочых фабрыкі. Выдуманая брыгада праверыла выкананьне леташняга дагавору.

У спрэчках па дакладу гаспадарніка рабочыя зьвярталі ўвагу на пункты, якія ня выкананы адміністрацыяй: адміністрацыя падчас залічала на работу ня членаў саюзу.

У новы калектыўны дагавор унесены рад новых пунктаў: выдача спэцвопраткі, ахова працы і інш. З боку некаторых рабочых была прапанова, каб выдаваць ім спэцвопратку пасьля тэрміну носкі перадаваць рабочым, але ўвесь калектыў рабочых гэту прапанову адхіліў і вынес пастанову аддаваць спэцвопратку прадпрыемству. У дагавор унесены пункт аб тым, каб на кваліфікавную работу ставілі і жанчын.

Адмоўным бокам у кампаніі перазаключэньня калдагавору трэба лічыць, што фабком праявіў некаторую спешнасьць: «хутчэй заключыць дагавор і з плеч далоў».

Вельмі дрэнна і тое, што праверачная брыгада чамусьці не зрабіла дакладу аб сваёй рабоце на сходзе рабочых. А трэба ведаць, што яна-ж усё такі выканала досыць значную работу.

Рабочыя з свайго боку абавязаліся выканаць прамфінплян на 1929-30 год і таксама выканаць пункты па салдагавору, як падняцьце прадукцыйнасьці працы, зьнішчэньне прагулаў, спазьненьняў і інш. Зьмяншэньне браку да гэтага часу было невыстарчальным, і рабочыя абавязаліся гэты пункт выканаць поўнасьцю.

Моцік Ц.

Прафсаюзы-тварам да вытворчасьці

ТРЫ ВАЖНЫЯ ГАСПАДАРЧЫЯ ПЫТАНЬНІ НА ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ

Рэарганізацыя кіраўніцтва прамысловасьцю

Прадпрыемства - асноўнае зьвяно ў сыстэме кіраўніцтва прамысловасьцю

Апошняе пасяджэньне прэзыдыуму ЦСПСБ (14-га сьнежня) сьведчыць аб некаторым пераломе ў рабоце нашых прафесыянальных арганізацый. На гэтым пасяджэньні былі абгаворваны тры вельмі важныя гаспадарчыя пытаньні бягучага гаспадарчага году. Гэтыя пытаньні — аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю БССР, аб выніках выкананьня прамфінпляну і зьніжэньні сабекошту прадукцыі за мінулы гаспадарчы год і аб мерапрыемствах па паляпшэньні якасьці прадукцыі, што вырабляецца прамысловасьцю ВСНГБ.

Па першым пытаньні дакладчык тав. Стракоўскі накіляў схэму рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю БССР, якая сама выцякае з сучаснага становішча беларускай прамысловасьці.

На працягу апошніх год амаль поўнасьцю зьмянілася тэхнічная база прамысловасьці. У адпаведнасьці з агульным ростам прамысловасьці, рэканструкцыяй тэхнічнай базы і буйным ростам прамысловага будаўніцтва павінна быць зьменена і сыстэма кіраўніцтва прамысловасьцю.

Як-жа павінна быць рэарганізавана кіраўніцтва?

Асноўным зьвяном сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю пасьля рэарганізацыі павінна зьявіцца прадпрыемства. У выніку рэформы кіраўніцтва прамысловасьцю для прадпрыемства павінны быць створаны такія ўмовы, **пры якіх кожная фабрыка і завод мелі б магчымасьць даць максымум вытворчых вынікаў.** Умовы гэтыя наступныя — **перавод прадпрыемстваў і цэхаў на гаспадарчы разрахунак, пашырэньне праў адміністрацыі, лепшае забесьпячэньне прадпрыемстваў патрэбнымі матар'яламі і сырцом, спэцыялізацыя прадпрыемстваў, г. зн. пераход да масавай і стандартнай вытворчасьці і г. д.**

Далей схэма прадугледжвае паступовую рэарганізацыю трэстаў па асобных галінах прамысловасьці і ператварэньне іх у аб'яднаньні або органы апэрацыйнага кіраўніцтва пры ВСНГ. Рэарганізацыя гэта павінна праводзіцца па меры поўнага пераводу на гаспадарчы разрахунак прадпрыемстваў, узмацненьня іх тэхнічнымі і плянавымі працаўнікамі. Гэта рэарганізацыя мае вельмі вялікае значэньне, бо ў выніку яе будзе дасягнута зьнішчэньне лішкавага прамежнага зьвяна (трэстаў), спрашчэньне апарату, пашырэньне самастойнасьці прадпрыемстваў і ўзмацненьне тэхнічнага кіраўніцтва з боку ВСНГ. Трэст, як форма кіраўніцтва прамысловасьцю БССР, павінен застацца

Трэці гаспадарчы даклад аб якасьці прадукцыі зрабіў інжынэр ВСНГ тав. Фрыд. Даклад яго быў вельмі каштоўны тым, што выкрываў больш асноўныя прычыны дрэннай якасьці прадукцыі на некаторых нашых прадпрыемствах.

Аналіз фактараў, якія мелі ўплыў на якасьць прадукцыі ў мінулым гаспадарчым годзе, гаворыць аб тым, што вінаваты трэба шукаць як па-за прадпрыемствам, так і на ім.

Да прычын, незалежных ад прадпрыемства, адносіцца: няправільнае хаваньне вырабаў у гандлёвых памяшканьнях (напрыклад, прадукцыя шэйнай прамысловасьці камечыцца і запыльваецца), адсутнасьць належнай колькасьці майстэрань для пераробкі і падладжаньня, дрэнныя ўмовы дастаўкі тавараў (дрожджы, папера).

Да гэтых-жа прычын адносіцца і дрэнная якасьць сырцу, паўфабрыкатаў, асноўных і дапаможных матар'ялаў, якія ідуць на выраб прадукцыі (напрыклад, нізкая якасьць прадзіва для панчошнай фабрыкі, дрэнная якасьць прадукцыі гарбарань для абуткових фабрык, ільнянога семя для алейнай прамысловасьці і г. д.).

На якасьць прадукцыі таксама мелі ўплыў і зношанасьць абсталяваньня (ільнапрадзільныя, гарбарныя, шкляныя і інш. прадпрыемствы). Некаторыя ўплыў аказвала і пашырэньне вытворчасьці і пераход на 2-3 зьмены, адсутнасьць належнага кадру тэхнэрсаналу, недавальняючыя ўмовы аховы працы і г. д.

Да вытворчых прычын дакладчык адносіць новыя малакваліфікаваныя кадры рабочых (панчошная, шэйная і інш. прамысловасьць), што выклікае павышэньне процанту браку, згару і бою, эканомію навываратаў на некаторых заводах, **якая часта прыводзіла, праўда, да зьніжэньня** сабекошту, але за кошт пагоршаньня якасьці прадукцыі і г. д.

На жаль, на прадпрыемствах не ўстаноўлены ў належнай ступені вытворчы тэхнічны кантроль. Слаба разгорнута работа лябараторый, няма ў іх належнай увазкі з вытворчасьцю. На ўтрыманьне лябараторый **мы выдаткоўваем у 5-6 раз менш, чым выдаткоўваецца па прамысловасьці РСФСР.**

Стандартызацыі не аддаецца належнай увагі. Амаль ва ўсіх галінах прадукцыя дае адхіленьне ад устаноўленых агульна-саюзных стандартаў. Кантроль над выкананьнем стандарт

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА 1930 ГОД

на старэйшую ў БССР вялікую штодзенную газэту

ЗЬВЯЗДА

ЦЭНТРАЛЬНЫ ОРГАН КП(б)Б. XIV ГОД ВЫДАНЬНЯ.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

ПАДПІСНАЯ ЦАНА	12 мес.	6 мес.	3 мес.	1 мес.
	9 р. 75 к.	5 р. — к.	2 р. 60 к.	— р. 90 к.

„ЗЬВЯЗДА" дае сваім падпісчыкам дадаткамі на ільготных умовах наступныя часопісі:

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ — ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на 1 м.—20 к. (замест 35 к.)

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ — Падпісчыкі «ЗЬВЯЗДЫ» будут атрымліваць гэту часопісь на ільготных умовах.

ОГОНЕК — ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на «ЗЬВЯЗДУ» з часопісьсю «ОГОНЕК» на 1 м.—1 р. 10 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: галоўнай канторай «ЗЬВЯЗДЫ» (Менск, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпоўнаважанымі.

ЗЬВЯЗДА

3-Я ПАЗЫКА ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Да 1-га студзеня выканаць кантрольную лічбу падпіскі на вёсцы

Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі па гарадох БССР прайшла з вялікім посьпехам і значна перавысіла намечаныя кантрольныя лічбы.

Сярод рабочых, служачых і чырвонаармейцаў рэалізавана больш за 150 проц. кантрольнай лічбы.

БССР ідзе амаль на першым месцы па падпіскі на пазыку ў СССР.

Але **рэалізацыя пазыкі на вёсцы праводзіцца яшчэ вельмі слаба.** Вынікі падпіскі сярод сялянства пакуль што незадавальняючыя. Выканана толькі 76,1 проц. кантрольнай лічбы.

На першым месцы ідзе **Віцебская акруга,** якая дабілася падпіскі сярод сялян на 83 проц. кантрольнай лічбы. На апошнім месцы—Гомельшчына, дзе рэалізавана толькі 56,4 проц. заданьня.

Такім чынам, **кантрольная лічба сярод сялян ня выканана, прычым той тэмп рэалізацыі, які наглядаецца за апошні час, зусім нездавальняючы і пагражае зрывам кампаніі.**

Наркамфін СССР т. **Бруханаў** прапанаваў усім саюзным рэспублікам дабіцца поўнага выкананьня кантрольнай лічбы сярод сялян да 1-га студзеня 1930 году. Да гэтага тэрміну засталося два тыдні, якія трэба шырока скарыстаць, каб выканаць заданьне ўраду.

Трэба дабіцца поўнага пералому ў рабоце савецкіх, партыйных і грамадзкіх арганізацый на вёсцы, у рабоце камісій дапамогі і кантрагентаў.

Дагэтуль праца арганізацый і камісій дапамогі на вёсны была зусім нездавальняючай, і няма чаго зьдзіўляцца, што ў радзе вёсак амаль не рэалізавана ні аднэй аблігацыі. Выяўлены рад выпадкаў, калі нізавыя савецкія працаўнікі выступалі супроць кампаніі і перашкаджалі яе посьпеху. У в. Пуцікі, Магілеўскага раёну, члены сельсавету склікалі сход, на якім было пастаўлена «ўстрымацца з падпіскай». У Добрамысьленскім сельсавеце, Віцебскай акругі член сельсавету **Леванкова** выступала на сходзе супроць пазыкі. На сялянскіх сходах Нізы і Жары, Віцебскай акругі, члены сельсавету **Клёцкін і Зубава** выступалі супроць кампаніі і дабіваліся яе зрыву. У в. Гасьцініцы, Талачынскага раёну, агульны сход пастанавіў «калектыўна купіць усёй вёскай аблігацыю на 50 руб. з раскладкай на кожны двор па 1 руб. 40 кап.».

Можна падаць яшчэ рад прыкладаў, калі нізавыя працаўнікі зьяўляліся рупарамі кулацка-нэпманскіх настрояў.

У тых раёнах, дзе добра праведзена падрыхтоўка, дзе добра працавалі камісіі дапамогі, дзе была мабілізавана грамадзкая думка наўкола пазыкі, дзе быў уцягнуты ў работу актыў і грамадзкія арганізацыі,—там рэалізацыя праходзіла з посьпехам і дала добрыя вынікі. У тых-жа раёнах, дзе пазыка была загнана на задворкі, дзе кампанія праводзілася «самацёкам», там мы маем такія-ж прыклады рэалізацыі, як вышэй пералічаныя.

Трэба адзначыць, што ў пагоні за выкананьнем кантрольных лічбаў у некаторых мясцох ужывалі прымусовыя меры, забываючы аб тым, што **рэалізацыя павінна праводзіцца добраахвотным парадкам, што посьпех залежыць тут ад добра пастаўленай агітацыйна-растлумачальнай работы.**

Глуская паштовая ашчадная каса навязала сялянцы замест грошай, якія яна атрымлівала праз Чырвоны Крыж з Амэрыкі за забітых сыноў, аблігацыі 3-й пазыкі.

Старшыня Каралінскага РВК, Мазырскага раёну, інструктуючы таварышоў, якія выяжджалі ў вёску для правядзеньня падпіскі, рэкамэндаваў ім сабраць кантрагентаў і прапанаваць ім абыйсьці ўсе двары і папярэдзіць аб штрафах, пені і байкоце ў выпадку адмаўленьня ад падпіскі.

У Бялынкавіцкім крэдытным т-ве сялянам, якія прыходзілі купляць штучнае ўгнаеньне, прапанавалі ўзяць у абавязковым парадку аблігацыі 3-й пазыкі індустрыялізацыі, інакш яны не атрымаюць угнаеньня.

Гэтыя адмоўныя моманты ў кампаніі пырока выкарыстоўваліся клясавым ворагам, які вёў агітацыю супроць пазыкі.

Усіх вінаватых у прымусовым навязваньні аблігацый трэба прыцягваць да судовай адказнасьці, бо іх мэтады работы падрываюць давер'е сялян да дзяржкрэдыту і супярэчаць дырэктывам партыі і савецкай улады. В.

Рэарганізацыя рыбнай гаспадаркі БССР

Акцыянэрнае т-ва „Белрыба". Мільён рублёў на будаўніцтва прудавых рыбных гаспадарак. У 1930 годзе „Белрыба" перадасьць каапэрацыі 23.000 цэнтнэраў рыбы для забесьпячэньня спажыўца

Акцыянэрнае таварыства «Белрыба» канчае сваё арганізацыйнае афармленьне. Гэтымі днямі статут т-ва будзе пераданы на зацьвярджэньне ў Эканомнараду.

Цяпер складаюцца сьпісы вазёр, рэк, прудоў і рыбаводных заводаў, якія павінны быць пераданы Наркамземам «Белрыбе».

Дагэтуль у эксплёатацыі Наркамзему знаходзілася 6 рыбных гаспадарак, якія ўключаюць вазёры рэспубліканскага значэньня. «Белрыбай» замест шасьці гаспадарак будзе арганізавана 20.

У іх увойдуць усе вазёры Беларусі, што маюць прамысловае значэньне з агульнай плошчай 67 тыс. гэктараў. Выкінуты праект канцэнтрацыі ўсёй рыбаводнай гаспадаркі на адным заводзе, на якім мяркуецца разводзіць каштоўныя пароды рыб — сігі і рапушка. Сігі прадстаўляюць сабою вельмі каштоўную рыбу. У вазёрах яны ня водяцца. На заводзе будзе наладжана штучнае разьвядзеньне сігаў з мэтай засяленьня сігамі цэлага раду вадаёмаў.

Прадбачыцца вялікае будаўніцтва прудовых гаспадарак, з мэтай разьвядзеньня карпа і ў нязначнай колькасьці карася. На будаўніцтва прудавых гаспадарак мяркуецца выдатковаць каля мільёна рублёў. Намячаецца пабудова на нескарыстаных балотных плошчах раду гідратэхнічных пабудоў, галоўным чынам, у Мазырскай, Менскай і Полацкай акругах. Будаўніцтва гідратэхнічных пабудоў ахопіць каля 2.000 гэкт. балотнай плошчы.

Трэба адзначыць, што карп зьяўляецца каштоўнай рыбай для мясцовага рынку і мае вялікае значэньне для экспарту. Попыт на карпа ёсьць у Нямеччыне і Польшчы. Дагэтуль карп экспартаваўся з Беларусі ў Варшаву ў самай нязначнай колькасьці.

Будаўніцтва прудавых гаспадарак адкрывае вялікія магчымасьці для экспарту гэтай рыбы. Новыя прудавыя гаспадаркі могуць быць пушчаны ў эксплёатацыю ў 1931 годзе. Экспарт рыбы з Беларусі дасьць да 200 тыс. рублёў валюты.

Апрача таго, значна папышраецца экспарт ракаў у Нямеччыну. Мяркуецца экспартаваць рака" ня менш. як на 20.000 рублёў.

Дагэтуль ня было наладжана забесьпячэньне лаўцоў матар'яламі для венцераў і сетак. Белсельтрэст і палаўнічы саюз гэтай справай амаль не займаліся. «Белрыба» возьме ўсё гэта на сябе. Будзе праводзіцца арганізаваная купля матар'ялаў і разьмеркаваньне іх праз арганізацыі лаўцоў. У сувязі з гэтым высоўваецца пытаньне аб аб'яднаньні лаўцоў у саўгасах або сампрамсаюзах. Патрэба Беларусі ў матар'ялах для рыбаводства вызначаецца ў 150 тысяч руб. Ставіцца пытаньне аб арганізацыі мэліярацыйных таварыстваў з рыбаразводным ухілам.

У сэзон 1930 году «Белрыба» намячае здабыць 23 тыс. цэнтнэраў рыбы і 800 тыс. ракаў. Уся рыба будзе рэалізавана праз каапэрацыйную сетку. **Для гэтай мэты заключаюцца дагаворы з каапэрацыйнымі арганізацыямі і ўжо ў 1930 г. каапэрацыя зможа атрымаць значную колькасьць мясцовай рыбы.**

Афармленьне «Белрыбы» зацягваецца з-за неўрэгуляваньня раду пытаньняў паміж установамі, трэба магчыма хутчэй вырашыць усе спрэчныя пытаньні з такім разьлікам, каб ужо з 1-га студзеня «Белрыба» змагла пачаць нармальную работу.

М. К.

Арганізацыя рыбнай гаспадаркі на Меншчыне на 10.000 пуд. рыбы

Дасьледчая партыя Наркамзему і Менакрэа абсьледвала 25.000 гэктараў балот у Пухавіцкім, Чэрвеньскім і Сьмілавіцкім раёнах.

Абсьледваньне праводзілася з прычыны намечаных работ на ўрэгуляваньні рэчышча Воўмы, якія дадуць магчымасьць асушыць усе балоты, раскіданыя ў вадазборы гэтае ракі.

Дасьледваньні паказалі, што на гэтым вучастку можна будзе арганізаваць рыбную гаспадарку на 1200—1500 гэкт.

«Белрыба» мяркуе з будучага году прыступіць да арганізацыі рыбных гаспадарак на гэтай плошчы. Гаспадаркі будуць арганізаваны шляхам пабудовы дамбаў і шлюзаў на рацэ, што дасьць магчымасьць заліваць гэту плошчу і культываваць рыбу карп.

Урэгуляваньне рэчышча Воўмы значна палепшыць умовы сплаву лесу па гэтай рацэ.

Арганізацыя рыбнай гаспадаркі на балотах каля ракі Воўмы будзе даваць мінімальна 10.000 пудоў рыбы ў год.

Усе дасьледчыя работы ўжо скончаны і зараз партыя працуе над складаньнем праекту. Работы на асушцы балот і арганізацыі рыбнай гаспадаркі ў раёне ракі Воўмы намечана пачаць у бягучым годзе.

Брыгада ЦК чыгуначнікаў—на Аршанскім вузле

Аршанскі вузел—на шляху да аздараўленьня

Брыгада ЦК чыгуначнікаў абсьледвала становішча на Аршанскім вузле чыгункі. Факты, якія прыводзіліся ў газэце «Зьвязда», поўнасьцю пацьвердзіліся. Брыгада выявіла, што прафработа і партыкіраўніцтва на чыгунцы праводзіліся вельмі слаба. Такое пытаньне, як хлебаперавозкі, разглядалася толькі 1-га лістапада. Калдагавор парушаўся ў радзе пунктаў. Звыштэрміновыя работы сваячасова ня ўлічваліся і не аплачваліся.

Гэта бяссыстэмнасьць адкрывала шырокае поле дзейнасьці для шкоднікіх і рвацкіх элемэнтаў. Дрэнна разгортвалася самакрытыка. Прафработнікі імкнуліся дыскрэдытаваць рабочых, якія выступалі з самакрытыкай. Наколькі туманна ўяўлялі сабе некаторыя члены партыі важнейшыя партыйныя пастановы, сьведчыць заява аднаго партыйца на партсходзе: «Адзінаначальле — гэта яўны заціск самакрытыкі».

Ужо пасьля таго, як друк і грамадзкасьць сыгналізавалі аб дзеяньнях шкоднікаў, сярод рабочых дэпо былі пушчаны два падпісныя лісты аб тым, каб узяць на парукі арыштаваных майстра Мартулёва і мацёра Карвіцкага. Падпіска гэта праводзілася па ініцыятыве кандыдаткі ў члены партыі **Папудзей.**

Ёй дапамагалі мацёр Сокалаў і сьлесар Іваноў. Было сабрана 200 подпісаў. Брыгада ЦК выявіла, што ініцыятары падпіскі ашукалі рабочых, заявіўшы, што падпісныя лісты ўзгоднены з мясцкомам.

60 проц. тых, хто падпісаўся, прасілі потым зьняць іх подпісы і лічыць іх несапраўднымі.

Ячэйка цягі выключыла Папудзей з партыі.

Зараз у рабоце партыйных і прафэсыянальных арганізацый Аршанскага вузла ёсьць поўны зрух. Арганізацыі чула рэагуюць на ўсякія выпадкі парушэньня вытворчай партыйнай і прафэсыянальнай дысцыпліны. Значна падцягнуліся мясцкомы службы руху і цягі. Аршанскі вузел знаходзіцца на шляху да поўнага аздараўленьня.

25 сьнежня—другі дзень індустрыялізацыі

Агульны сход рабочых дражджавога заводу «Чырвоная Зорка» аднагалосна пастанавіў абвясьціць дзень 25-га сьнежня другім днём індустрыялізацыі. Увесь заработак у колькасьці некалькіх сотень рублёў будзе адлічаны ў фонд індустрыялізацыі. 26-га сьнежня завод працуе звычайным тэмпам.

***

Рабочыя фабрыкі «Адраджэньне» пастанавілі працаваць 25-га сьнежня і заработак аддаць у фонд індустрыялізацыі.

Рабочыя-яўрэі з фабрыкі ўжо адпрацавалі другі дзень індустрыялізацыі 14-га кастрычніка—дзень яўрэйскага сьвята «ём-кіпур».

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Саюз савецкіх і гандлёвых служачых. Нарада скарбнікоў мясцкомаў і рупкомаў па пытаньні аб каштарысу на 1930 год—а 7 гадзіне.

Пэд. габінэт.—Сход сэкцыі палітэхнічнай адукацыі, а 7-й гадзіне. Заняткі гуртка 130 для дашкольніц—а 8 гадз.

Сёньня, а 7 гадз. увеч.

АДБУДЗЕЦЦА

ПРАЦЯГ ПЛЕНУМУ

Мен. т-ва «Прыхільнікі Дзяцей» (Савецкая, 40).

На пленум запрашаюцца прадстаўнікі бюро ячэек і рэдакцый мясцовых газэт.

— Сёньня, 17-га сьнежня, пачынаецца праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б галянтарэйнай фабрыкі. Першы праверачны сход адбудзецца а 3-й гадзіне дня ў памяшканьні фабрыкі.

ПРАВЕРКОМ І БЮРО ЯЧЭЙКІ.

17 сьнежня, а 6-й гадз. увеч. у памяшканьні Кастрычніцкага райкому—нарада сакратароў яч. КП(б)Б, старшынь фабзаўкомаў (партыйцаў), гаспадарнікаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў (партыйцаў) па пытаньнях: 1. Выкананьне дырэктыў аб увядзеньні адзіначальнасьці і 2. Формы і мэтады работы прымацаваных прадпрыемстваў да ўстаноў.

— Сёньня а 4 гадзіне дня ў клюбе друкароў (Ленінская, 13) склікаецца пазачарговы агульны сход членаў сэкцыі працаўнікоў друку. Яўка ўсіх членаў сэкцыі абавязкова.

БЕЛБЮРО СЭКЦЫІ.

ЗАЎТРА

Пэд. габінэт. Пленум акруговае мэтадычнай камісіі, а 7-й гадзіне.

Дэкадны камвуз. Чарговыя заняткі на ўсіх 3-х цыклях адбуд. 18 сьнежня ў 18 гадз. Лектары т. т. Галанза, Гурэвіч і Югаў.

Дом Камасьвяты. З 15 сьнежня занят. гурт. па ням. мове 5, 9, 15, 19, 25 і 29 кож. месяца ад 19—21 гадз., занят. гурт. па англ. мове нач. 18 сьнеж. у 20 гадз. і 4, 8, 13, 18, 22, і 28 кожн месяца ад 19 да 21 гадз. Запіс у гурт. ня спыняецца.

Клюб імя Леніна. 17-XII сход дэлегатак другой групы пры Кастрыч. РК у 19 гадз. Зьяв. дэлег. наст. яч. ДПУ, НКФ, НКЮ, ЦРД, дому грудніч дзіцяці, тубінстытуту, БДУ, яўпэдтэхнікуму, фабрыкі, спраўдому, шчацін. ф-кі, банк. устаноў, страхкасы, абут. майстр. і АВВШ.

Кастрыч. РК МОПР'у выклік. на 19 гадз. 18 сьнежня старш. і сакр. яч. МОПР'у ЦПУ, спецклясы пры 9-й сямігір., зав. «Энэргія», арцелі «Уперад», ЖАКТ'у № 21, дому дзіцяці № 2, мясцкому 3 таварн., вагон майстэр., мясцк. № 3 хат. работ., зав. «Чыр. Зара», школ —18, 32, 33, ЖАКТ'у № 6, усіх пэхаў зав. «Бальшавік», ЦКК-РСІ, хэмфармзаводу, мясцк. № 1 таварн. дэпо.

ДОМ АСЬВЕТЫ

ПЯТНІЦА, 20 СЬНЕЖНЯ для членаў саюзу — КАНЦЭРТ ВАХАЛЬНАГА КВАРТЭТУ імя П. В. ЛЫСЕНКА. Падрабязнасьці ў афішах. Пачатак а 8 г. 30 м. Білеты ад 30 кап. да 60 к. у канц. Дому з 12—2 і з 6—10 г. увеч.

СУБОТА, 21 СЬНЕЖНЯ для членаў саюзу — Бел. Дзярж. тэ-тар пад кіраўн. ГАЛУБКА — будзе пастаўлена п'еса — „ПЛЫТАГОНЫ". Пачатак а 8 г. 30 м. Білеты ў канц. Дому з 12—2 і з 6—10 г. увеч.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

ЧАЦВЕР, 19 сьнежня, Па Лопэ-дэ-Вэга — Для членаў саюзу саўгандаль служачых. Білеты ў клюбе саўгандальслужачых. АВЕЧАЯ КРЫНІЦА. Пачатак спэктаклю роўна ў 8 ч. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ 2-ГІ ТЫДЗЕНЬ)—(2-ГІ ТЫДЗЕНЬ „ЗДАНЬ, якая не варочаецца". Пачатак роўна а 7 г. — Каса—ад 5 гадз.

КІНО ПРОЛЕТАРЫЯНА — 3-ці—апошні тыдзень—3-ці ЗЯЛЕНЫ ЗАВУЛАК. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО ПРОЛЕТАРЫ — 2 ГІ ТЫДЗЕНЬ)—(2-ГІ ТЫДЗЕНЬ СЫН ЗОРА. Кіно-раман у 8-мі частках. У галоўнай ролі ДУГЛАС ФЭРБЭНКО. Пачатак сэансаў а 6 гадз. 45 м., 8 г. 30 м. і 10 г. 15 м. Каса— ад 5 з пал. гадз.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр „КЫ ПІЯНЭР" (Будынак кіно „Пралетарый") — Ад панядзелка, 16 сьнежня ЗАЛАТЫ МЁД у 5 частках. Звыш праграмы цікавая камэдыя ЦІХАЯ СЯМЕЙКА ў 2 частках. Каса зачынена штодзенна ад 2 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК — Ад аўторка, 17-га сьнежня Выдатны мастацкі фільм ЯЕ ШЛЯХ. драма ў 7 частках. Пач. 1 сэансу, а 6 г. 30 м. Каса—ад 5 г.

БЮРО ПАДПІСКІ

Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва

ПРОСІЦЬ У ТЭРМІНОВЫМ ПАРАДКУ ЗЬВЯВІЦЦА ў памяшканьне Бюро (Пляц Волі, 5)

УСІХ кнігараспаўсюджвацеляў БДВ, якія працуюць у г. Менску

па справе распаўсюджаньня выданьняў:

т. т. Кучарава В. Е., Юрэвіча А. М., Зубава А. І., Дзешчыца, Дрыго, Маскчэнка, Разоўскага, Федарава, Лабанка, Скарыцкага, Дзядзюлю, Зяцкевіча, Таўбіна, Грамовіча, Ізоха Ф., Калугіна Ф. І.

Не зьявіўшыяся да 25-га сьнежня г. г. будуць лічыцца выбыўшымі з складу кнігараспаўсюджвацеляў.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ЯЎРЭЙСКАГА — МЭДЫЧНА-САНІТАРНАГА Т-ВА

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-63

АДКРЫТА ад 11 гадз. ран. да 9 г. увеч.

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

Па ўнутраных з 11—1½ г. дня і ад 2—7 г. увеч.
» зубных з 11—1½ г. дня і ад 5—7½ г. увеч.
» жаночых з 6—8 г. увеч. Па хваробах вока з 7—9 г. ув.
» нервовых з 6—8 г. увеч. » хваробах вуха, горла і носа з 7—9 г. увеч.
» хірургічн. з 5—7 г. увеч.

Адкрыт раўнім прыём па ўнутраных, дзіцячых і зубных хваробах з 11—2 гадз.

Электра-сьвета-лячэньне і нарц адкрыт з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 11—1 гадз. дня і 6—8 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

Кансультацыя прафэсароў:

Праф. Кроль—чацьв. 6 г. ув.
» Быдрын—аўторк. 6 г. ув.
» Рубашоў—панядз. і пятн. 6 г. ув.
» Буран—пятн. 3 г. дня.
Д-р Макасэон—аўторк. 7 г. ув. (па стр. аўк.-кішэчн.).
Доцэнт М. Н. Шапіра—па аўторк. з 5 ч. увеч.
Праф. Камінскі—панядз. і чацьв. з 3 г. дня.
» Сакалоўскі—серад. з 6 г. увеч.
» Мелкіх—чацьв. 6 г. ув.
» Гаусман—серадох 6 г. увеч.
Д-р Розэнталь—серад. і суб. 8 г. ув. (па сноўных)

Прыём хворых па лекавых кніжках таварыства.

— Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную плату —

ПРАПАЎ САБАКА

14-XII Прыблудзілася КАРОВА

Зэльвенская Грыгораўская, 1, кв. 1

«ПОНТЭР», РАБЫ з кафейнымі плямамі, 10-ці месяцаў. За ўтайку буду праследаваць па закону. Прашу пагадаміць па адрасе: пасаж. вакзал, казённы будынак, д. № 21,

ГОС. АКЦ. ИЗД. О-ВО „ЗЕМЛЯ И ФАБРИКА" МОСКВА. Никольская, 10/2

ЖУРНАЛ ПУТЕШЕСТВИЙ, ПРИКЛЮЧЕНИЙ, НАУЧНОЙ ФАНТАСТИКИ, КРАЕВЕДЕНИЯ и ОХОТЫ

ВСЕМИРНЫЙ СЛЕДОПЫТ

6-й год издания

ЕДИНСТВЕННЫЙ иллюстрированный ежемесячник этого типа.

„СЛЕДОПЫТ" дает своим читателям увлекательные романы, повести и рассказы, построенные на интересном занимательн. сюжете.

В 1930 г. ДАЕТ СВОИМ ПОДПИСЧИКАМ 24 КНИГИ СОБРАНИЯ СОЧИНЕНИЙ Г. УЭЛЛСА

знаменитого современного английского писателя Фантастических романов, повестей и рассказов. Это общедоступное издание фантастических произведений УЭЛЛСА является ценным вкладом в библиотеку каждой семьи, школы, клуба, избы-читальни.

12 номеров „ВСЕМИРНЫЙ ТУРИСТ" ежемесячного журнала путешествий и туризма в СССР и в других странах.

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ:

I абонемент	II абонемент
12 кн. „Вс. Следопыта"	12 кн. „Вс. Следопыта"
12 №№ „Всем. Туриста"	24 кн. Г. УЭЛЛСА
на год . . 4 р. 50 к.	на год . . 8 р. — к
на 6 мес. . 2 р. 50 к.	на 6 мес. . 4 р. 25 к.
на 3 мес. . 1 р. 40 к.	на 3 мес. . 2 р. 25 к.
на 1 мес. . — 50 к.	на 1 мес. — 80 к.

При подписке на год по II абонементу допускается рассрочка платежа: при подписке—2 р. 50 к., к 1 мая—2 р. 50 к. и к 1 сентября—2 р. Годовые подписчики, внес. при подписке по II абон. полностью подписную плату, за доплату в 1 р. получают 12 номеров иллюстрированного журнала „ВСЕМИРНЫЙ ТУРИСТ".

ОТКРЫТА ПОДПИСКА на 1930 год

Все подписавшиеся на „Всемирный Следопыт" и „Вокруг Света" и внесшие подписную плату за оба журнала полностью до 1-го января, непосредственно в Контору Изд-ва получают бесплатно „Всемирный Турист".

САМЫЙ РАСПРОСТРАНЕННЫЙ ИЛЛЮСТРИРОВАННЫЙ ЖУРНАЛ ПУТЕШЕСТВИЙ И ПРИКЛЮЧЕНИЙ НА СУШЕ, НА МОРЕ И В ВОЗДУХЕ

ВОКРУГ СВЕТА

4-й год издания (выходит САМОСТОЯТЕЛЬНЫМ изданием)

В 1930 г. „ВОКРУГ СВЕТА" выходит каждые десять дней, ВСЕГО В ГОД 36 НОМЕРОВ.

Журнал будет выходить в обложке, исполненной по способу глубокой печати—меццо-тинто.

В качестве приложения в 1930—31 г. будет дано 48 КНИГ собр. соч. популярнейшего писателя ЖЮЛЯ ВЕРНА

В 1930 г. БУДУТ ДАНЫ ПЕРВЫЕ 24 КНИГИ

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ

на «ВОКРУГ СВЕТА» без приложений: на год (36 номеров) — 3 р. 20 к., на 6 м. — 1 р. 65 к.; на 3 м. — 85 к. и на 1 м. — 30 к. С приложением: на год (36 номеров журнала и 24 книги Жюля Верна) — 7 р. 50 к., на 6 м. — 4 р.; на 3 м.—2 р. 15 к.; на 1 м.—75 коп

При подписке на год по II абонементу допускается рассрочка при подписке — 3 р., 1 мая — 2 р. 25 к. и 1 сентября—2 р. 25 к.

О отдельную продажу приложения не поступает, и подписка на них отдельно по ценам не принимается.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: Москва, Никольская 10/2. Отдел Период. Изданий Зиф, а также во всех Отделениях и Представительствах Изд-ва, в отделениях и магазинах Госиздата, повсеместно на почтово-учётных шкафах Контрагентства Печати, а на транспорте уполномоченными „Гуана".

УСЕ ПАВІННЫ ВЕДАЦЬ, ШТО ХУТКА ВЫХОДЗІЦЬ „ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ"

ДВУХТЫДНЁВАЯ ІЛЮСТРАВАНАЯ ЧАСОПІСЬ.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе высьвятляць у мастацкім слове і багатай ілюстрацыі рост і разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва БССР і ўсяго Савецкага Саюзу, рэканструкцыю народнае гаспадаркі, посьпехі індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, шляхі культурнае рэвалюцыі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе знаёміць чытача з рэвалюцыйнымі падзеямі ўсяго сьвету, а таксама і з важнейшымі зьявішчамі сусьветнай эканомікі і культуры.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" зьмяшчае: апавяданьні, вершы, нарысы, падарожжы, фэльетоны, артыкулы з палітычнага, эканамічнага, культурнага і мастацкага жыцьця. Мастацкія навінкі, ілюстрацыі, рэпрадукцыі карцін выдатнейшых мастакоў, а таксама гумарэскі, пародыі, старонкі сатыры і гумару з адпаведнымі шаржамі і карыкатурамі.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" будзе адлюстроўваць усё бягучае жыцьцё мастацтва як савецкага, так і сусьветнага, найбольш буйныя зьявішчы літаратуры, тэатру і кіно.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, Савецкая вул. № 63, Беларускае Дзяржаўнае

Ад Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР.

5-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ па 2-ой пазыцы індустрыялізацыі

адбудзецца 20, 21 і 22 сьнежня 1929 г. у г. БАКУ.

У гэтым тыражы ўдзельнічаюць усе аблігацыі процантна-выйгрышнага і бяспроцантна-выйгрышнага выпускаў пазыкі, за выключэньнем выйграўшых у першых чатырох тыражох.

Усяго па абодвых выпусках будзе разыграна 108.600 выйгрышаў на суму 11.677.200 рублёў.

Афіцыйныя табліцы выйгрышаў будуць друкавацца ў газэце «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» і ў газэце, якая выдаецца па месцы правя-

Дзе з 1930 год падпісацца на газэту або часопіс?

ПАДПІСКУ на ЛЮБУЮ ГАЗЭТУ або ЧАСОПІС ПРЫМАЕ ТОЛЬКІ ГАЗЭТНАЕ БЮРО

Ленінская, 34 (пошта), а таксама паштальёны.

Справа „тэлефонных" бюракратаў

Менскі акруговы суд разгледзеў справу загадчыка Менскай тэлефоннай станцыі інжынэра-электрыка Іванова, загадчыка тэх. складу Бараноўскага і заг. дзелаводствам тэлефоннай станцыі Альфонскага. Усе падсудныя абвінавачваліся ў зрыве пляну работ па абсталяваньні Менскай тэлефоннай станцыі. Замест практычнае работы, супрацоўнікі станцыі займаліся бюракратычнай перапіскай з акругай сувязі і няправільнай інфармацыяй аб становішчы тэлефоннай станцыі, уводзілі ў зман вышэйшыя інстанцыі. Была спынена на некалькі гадзін тэлефонная сувязь паміж Масквой і Варшавай, нібы з-за недахвату катодных лямп у той час, як гэты матар'ял быў даўно атрыманы і ляжаў на складзе.

Падсудныя сваю віну прызналі. Бараноўскі прыгавораны на 1 год 6 месяцаў зьняволеньня, Альфонскі—на 1 год, Іваноў апраўданы.

***

У часе суду выявілася, наводле дадаткова паданых вестак, нястача розных матар'ялаў на складзе тэлефоннай станцыі больш, як на 3.000 рублёў. Справа аб гэтай нястачы перадана сьледчым органам для прыцягненьня загадчыка тэхскладам Бараноўскага да адказнасьці ў крымінальным парадку.

Суд над кулакамі-тэрарыстымі

У в. Гольбэрг, Халопеніцкага раёну, група кулакоў пад кіраўніцтвам папа-старавера Дзейкі Харлама вяла контрэвалюцыйную работу і імкнулася арыштаваць мерапрыемствы Савецкай улады на вёсцы. Гэтыя кулакі выступалі супроць калектывізацыі і пагражалі забойствам усім тым, хто ня ўступіць у іх «партыю». Самаабкладаньне на вёсцы зрывалася. Сходаў беднаты аб калектывізацыі і зямляўпарадкаваньні ніяк нельга было правесьці. Апрача таго, Дзейка Харлам, каб плаціць менш падатку, папрасіў бедняка Чарвякова перапісаць на сябе 7 гэктараў зямлі і, калі апошні не згадзіўся, то Дзейка праз свайго батрака Іванова спаліў будынкі Чарвякова, заплаціўшы за гэта Іванову 10 рублёў. Дзейка таксама рабіў замах на старшыню калектыву «Серп» Самсонава. Было ўстаноўлена, што ўдзельнікі гэтае кулацкае групы Дзейка — Лафэт і Восіпаў у 1920 годзе вабілі ў лесе чырвонаармейца.

Усяго па гэтай справе было прыцягнута да адказнасьці 12 чалавек. Справу разглядала выязная сэсія Менскага акруговага суду.

Абвінавачаныя прыгавораны: Дзейка Харлам па 70 арт. КК (тэрарыстычны акт супроць прадстаўнікоў савецкай улады) на 8 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Дзейка С. — на 5 год, Іваноў — на 4 гады. Усе іншыя абвінавачаныя прыгавораны на розныя